№ 46 (356) 12 сьнежня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



### Хімэры сярод нас

Некаторыя людзі зьяўляюцца хімэрамі.

старонка 13

### Веліч і падзеньне Івана Шамякіна

старонка 12

### Сакрэты росту

Даеш ВУП на 20%.

старонка 6

### ТВ-праграма
### Дзе варта быць
### Дыскаграфія

### Грып ідзе

**Эпідэмія грыпу ў краіне прагназуецца на канец сьнежня — пачатак студзеня.** Якасная прышчэпка ад хваробы каштуе 15400 руб.

### Адмененыя льготы для мэдалістаў

**Усе абітурыенты, незалежна ад наяўнасьці мэдалёў пасьля сканчэньня школы,** будуць здаваць адзіны дзяржаўны іспыт зь беларускай альбо расейскай мовы і два іспыты з профільных дысцыплінаў. Для мэдалістаў захаваная толькі адна льгота — пераважнае права залічэньня пры аднолькавай колькасьці балаў.

### Крок насустрач Эўразьвязу

**МЗС Беларусі пастанавіў, што грамадзяне краінаў шэнгенскае зоны могуць атрымліваць беларускія візы** без запрашэньня ад беларускай арганізацыі ці грамадзяніна. Такую ж палёгку атрымаюць і грамадзяне Швэцыі ды Вялікай Брытаніі. Спрашчэньне працэдуры зробленае ў разьліку на адэкватныя крокі насустрач.

### КДБ супакойвае грамадзянскую супольнасьць

**Бо хоча кантраляваць Інтэрнэт.** Старшыня КДБ Леанід Ерын упэўнены, што гэта неабходна, бо Сецівам усё часьцей карыстаюцца тэрарысты і мафія. А грамадзянскай супольнасьці, якая «бачыць у гэтым уціск правоў чалавека і ўтрапёна змагаецца за свае свабоды», Ерын раіць падыходзіць да пытаньня «зь дзяржаўнага пункту гледжаньня» — «тут павінен быць улічаны найперш інтарэс спэцслужбаў, якім мусіць быць дадзеная магчымасьць кантраляваць Інтэрнэт». Спадару Ерыну ня варта чакаць узаемнасьці.

### Сільнова для ліцэістаў

**Яшчэ адзін знак салідарнасьці зь ліцэістамі:** паэтка Людка Сільнова перадала ў падарунак навучэнцам Беларускага ліцэю 17 асобнікаў сваёй кнігі «Зеленавокія вої і іх прыгажуні». Беларускі ліцэй быў разагнаны ўладамі. Аднак 120 дзяцей працягваюць займацца з выкладчыкамі на кватэрах.

### Калядны нумар «НН»

**Адмысловы, Калядны нумар «НН» выйдзе ў пятніцу, 26 сьнежня, на 24 старонках.** У нумары будуць падведзеныя вынікі году. І як заўжды, аматары сакавітага беларускага слова знойдуць у ім «Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў».

# І Пуцін такой маладой

## Небясьпечны сындром

Якія зьмены ў канстытуцыю можа ўнесьці паслухмяная Дума?

Неафіцыйна абмяркоўваюцца два варыянты падаўжэньня тэрміну прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Уладзімера Пуціна. Або тэрмін будзе павялічаны з чатырох да сямі гадоў. Або будзе скасаванае абмежаваньне паўнамоцтваў двума тэрмінамі. У наступныя два гады можа ажыцьцявіцца і яшчэ адна канстытуцыйная рэформа.

Мэта магчымае адміністрацыйнае рэформы — дасягненьне лепшае кіраванасьці краінай і кантроль за прыбыткамі ад продажу сыравіны. Існуюць два праекты такое рэформы. Паводле аднаго зь іх, 88 суб’ектаў фэдэрацыі будуць замененыя 15 губэрнямі, як у царскія часы. Зьнікнуць нацыянальныя аўтаноміі — Татарстан, Башкартастан, Чувашыя. Губэрнатары будуць не абірацца, а прызначацца Крамлём.

Другі праект яшчэ больш наватарскі. Ён прадугледжвае падзел краіны на восем фэдэральных акругаў. Сем зь іх ужо існуе, яшчэ адна можа расьцягнуцца ад Нарвэгіі да Ахоцкага мора і злучыць усе паўночныя тэрыторыі, найбольш багатыя на паклады карысных выкапняў. Гэтая «экстрэмальная акруга» будзе падпарадкаваная непасрэдна Крамлю.

Абодва праекты прадугледжваюць пазбаўленьне губэрнатараў кантролю за продажам сыравіны. Вырашыцца таксама пытаньне кампаній, што твораць у дробных рэгіёнах своеасаблівыя «дзяржавы ў дзяржаве».

**Вынікі выбараў у Расеі — старонкі 3—5.**



PHOTO BYMEDIA.NET

# Тэст году. Пральныя парашкі




**Якія пральныя парашкі набываць? Ці прапарцыйна залежыць цана парашкоў ад якасьці? Ці верыць рэкляме? Кіпяціць — не кіпяціць? Чытачы «НН» атрымаюць найбольш поўны, заснаваны на практычным выпрабаваньні адказ.**

Думка наладзіць параўнальны тэст пральных парашкоў наведала мяне пасьля набыцьця прыстойнай пральнай машыны. Першыя тыдні пралка круціла дзень і ноч: па-першае, маем малое дзіцятка, па-другое, гаспадыньшы маёй на радасьцях захацелася перамыць усе рэчы ў доме, ажно да мяккіх цацак і коўдраў. Пасьля вэжканьня з малагабарытнай «Марай» мала якая жанчынка не зазіхціць ад шчасьця, пабачыўшы, як спраўна пярэ, палошча ды сушыць якінебудзь моцны й разумны «швэд» або «немец» (а для патрыётаў ва ўсім — мянчук атлянтаўскага целаскладу).

**Працяг на старонцы 7.**

### «НН» ад незалежнага распаўсюдніка

**Працягваецца падпіска на другое паўгодзьдзе.** Дарэчы, падпісацца можна ня толькі праз «Белпошту». У прыватным агенцтве «Эй Бі Прэс-Сэрвіс» падпісная цана «НН» на паўгоду складае: для ведамасных падпісчыкаў 17885 руб. з ПДВ, для індывідуальных падпісчыкаў 15426 руб. Газэту Вам будзе дастаўляць кур’ер. Даведкі праз т.: 223-44-52, 226-87-99.

### Някрошус у Палацы Рэспублікі

**13 і 14 сьнежня даюць «Вішнёвы сад» паводле Чэхава ў пастаноўцы Някрошуса. Квіткоў, таньнейшых за 15000, у продажы ўжо няма. 14-га адбудзецца і закрыцьцё фэстывалю «Адкрыты фармат», у рамках якога да нас прыехаў лідэр літоўскага тэатру. Да таго, у чацьвер, на Малой сцэне Купалаўскага прэм’ера — «Налу». У пятніцу 12 сьнежня тэатар «Дзе-я» прапануе спэктакль «Рамантыкі» паводле Растана.**

# Тлустая рыса пад мінулым

Сярод іншых матэрыялаў пра вынікі думскіх выбараў у Расеі сёньняшні нумар «НН» прапануе ўрыўкі з рэдакцыйнага артыкулу газэты «Беларусь сегодня» (старонка 4). Такі камэнтар быў немагчымы ва ўрадавай прэсе чатыры ці восем гадоў таму. Цяпер жа ацэнкі афіцыёзу і незалежнае прэсы супалі да дзясятых.

Улады эвалюцыянавалі. Павал Якубовіч у «БС» разважае з пазыцый суб’ектнасьці Беларусі. Лукашэнкаўцы таксама пачалі глядзець на Расею як на «незразумелую», а значыць, чужую. У прынцыпе, тут няма нічога дзіўнага. Аналізаваць вынікі расейскіх выбараў з адных пазыцый будуць Кучма і Ючшанка або Бразаўскас і Ландсбэргіс. Або вось іншы прыклад: Клінтан і Буш розныя, як саксафон і банджа, ды на замежнай палітыцы ЗША гэта нязначна — як для староньняга вока — адбілася. У нас да апошняга часу было інакш.

Беларуская прэзыдэнтура зрэагавала на вынікі думскіх выбараў нарадаю па пытаньнях замежнай палітыкі. Гаворка пра «дыялёг» з ЗША ды Эўразьвязам і «паэтапнае наладжваньне адносінаў» 8 сьнежня ўспрымалася як палітычны сыгнал Захаду і папярэджаньне Расеі.

У той жа дзень у Вільні «Пяцёрка з плюсам» давала прэс-канфэрэнцыю ў літоўскім Сойме. Цалкам зьмененая рыторыка. Ні слова пра дыктатуру, ізаляцыю ды ірацка-югаслаўскі варыянт. Прасілі, каб літоўцы дапамаглі «палепшыць імідж Беларусі ў Эўропе». Апазыцыянэры гаварылі карава і нецікава, але краіну ня хаялі. Прамаўлялі з адказнасьцю за яе. І гэта адзінае, што можа ўратаваць — і, мабыць, ня іх пэрсанальна, а т.зв. дэмрух.

Вось вам тэндэнцыя. Улады і апазыцыя пачынаюць канкураваць на адным полі, гаварыць на адной мове, і гэта здаровае змаганьне. «НН» пісала пра гэта гады два таму. Тады хто пасьмяяўся, хто папляваўся.

Важна падкрэсьліць, што і тыя і тыя робяць гэта змушана. Адныя засталіся без сваіх цацак — югаслаўскага/польскага варыянтаў, другія — без адроджанага СССР і крамлёўскага пасаду. Ад рэалізму аж вочы забалелі, як на выхадзе з кінатэатру. Магчыма, сёньня сёй-той нават пашкадаваў, што зьвязаўся з палітыкай, такая яна раптам выявілася нерамантычная і прыземленая.

Тым ня менш, у краіне фармуюцца новыя бачаньні замежнапалітычных прыярытэтаў. Пошук замежнапалітычнага кампрамісу апярэджвае ўнутрыпалітычны. Ва ўнутранай палітыцы як дзеяліся неймаверныя рэчы, так і дзеюцца. Як ліцэісты займаліся «ў лесе», так і займаюцца. І Праляскоўскі робіць выгляд, што так і трэба, што гэта і ёсьць новая ідэалёгія. (Пра нісянеціцу з помнікам Геніюш, адмену белмоўных стандартаў — побач).

Аднак замежнапалітычны курс застанецца няўстойлівым, а паляпшэньне адносінаў з Захадам — сытуацыйнымі рухамі без адказу, пакуль не дасягнуты ўнутрынацыянальны кансэнсус у прынцыповых палітычных, эканамічных і нацыянальных пытаньнях, пакуль улады і апазыцыя не пачнуць гуляць у адным стылі і на адным полі. (Гл. таксама сёньняшнюю рубрыку «Правым вокам».) Заўважу, што аднолькавага разуменьня базавых нацыянальных інтарэсаў цяжка дабіцца, пакуль не дафармаваная нацыя. Кампрамісы выпрацоўваюцца ў парлямэнце, калі ён абраны на свабодных выбарах. Але гэта другія вялікія тэмы. Сёньня — пра іншае, аб мінімальных перадумовах.

Пры якіх варунках лукашэнкаўцы і апазыцыя загавораць на ўнутрыпалітычныя тэмы адной мовай? Умовамі sine qua non падаюцца дзьве наступныя: тлустая рыса пад мінулым, пад 90-мі гадамі, і адмова ад гвалту як спосабу дасягненьня палітычных мэтаў. Іншае асновы не відаць.

Альтэрнатыва такому «пераходу на супольную мову», гэткай дэмакратызацыі ў згодзе, ёсьць. Гэта міжнародная ізаляцыя, каляпс, інкарпарацыя ў Расею, сыход Лукашэнкі, разборкі з Усходам і іншыя дурніцы ў духу новае п’есы Шалкевіча (старонка 2). Чарговасьць гэтых зьяваў можа быць іншай, вынік толькі нязьменны. Зьмена Лукашэнкі, але адначасова — зьмена апазыцыі. Або зьмена апазыцыі, пасьля чаго на працягу сэзону — зьмена Лукашэнкі.

Аднаму і другому бакам такі кампраміс сёньня здаецца і непатрэбным, і немагчымым, а сама гаворка пра яго — ідэалістычнымі фантазіямі сярэднеэўрапейскага інтэлігента. Але, спадарства, 70% беларусаў хочуць, каб краіна ўвайшла ў Эўразьвяз. Гэта рана ці позна абавяжа.

**Андрэй Дынько**

## Дзяржстандарт асадзіў назад

**Насуперак ранейшаму рашэньню Дзяржстандарту, з 1 студзеня 2004 г. абавязковых надпісаў па-беларуску на ўпакоўках нехарчовых тавараў ня будзе.** Пра гэта «НН» паведаміла галоўны спэцыяліст управы стандартызацыі Дзяржстандарту Галіна Гатоўка. Матывацыя — «паводле жаданьня вытворцаў».

Паводле ейных словаў, зьмены выкліканыя «валам зваротаў ад многіх беларускіх вытворцаў»: маўляў, надта многа давядзецца перакладаць — пашпарты, інструкцыі па карыстаньні й г.д. Аднак, як стала вядома «НН», праблемы зь перакладам этыкетак узьніклі толькі ў беларускіх прадпрыемстваў: замежныя вытворцы, кшталту «Panasonic» ды «Siemens», ужо скончалі пераклад сваёй інфармацыі на беларускую мову.

Беларускай мовы на этыкетках дабіўся ТБМ, падтрымаў яго ў гэтым Канстытуцыйны суд. ТБМ мае намер змагацца за адмену новага рашэньня Дзяржстандарту.

## «Бярозка» стане прыскам

**З Новага году спыніцца выхад дзіцячага часопісу «Бярозка».** Рэдактара Ўладзімера Ягоўдзіка звольнілі «ў сувязі з сканчэньнем тэрміну кантракту». «Бярозка» мае ператварыцца ў каляровую ўкладку ў «Маладосць». Апошнія гады часопіс ледзь ліпеў. Летась рэдакцыя нават адмовілася ад выплаты ганарараў, каб падпісаць на «Бярозку» бібліятэкі. Зорныя часы «Бярозкі» прыпалі на пачатак 90-х. Тут друкаваліся першыя коміксы, постэры спартоўцаў і рокераў. Гіне найстарэйшы часопіс, які налета адзначыў бы 80 гадоў.

На думку некаторых спэцыялістаў, часопіс можна было б ўратаваць, перадаўшы яго недзяржаўнаму выдаўцу з захаваньнем ранейшага аб’ёму бюджэтных датацый.

**Аркадзь Шанскі**

## Зэльва: спакой для Геніюш!

**У Зэльве — нісянеціца з помнікам Геніюш.** Паэтку, увасобленую ў бронзе, паставілі на дзядзінцы мясцовае царквы («НН» №45). Улады напалохаліся. Бацюшку выклікалі ў райвыканкам, запатрабавалі дазволу з аблвыканкаму, Мінкульту і Саўміну. Маўляў, Геніюш не рэабілітаваная, і вэтэраны вайны могуць быць незадаволеныя. Хоць ніякіх заяваў ад незадаволеных вэтэранаў няма.

Намесьніца старшыні райвыканкаму Алена Коўш запэўнівае, што «пра дэмантаж гаворкі не ідзе». Дый адвакат Гары Паганяйла патлумачыў, што прэтэнзіі райвыканкаму беспадстаўныя: бюст усталяваны на царкоўнай плошчы. Саўмін ня можа зацьвярджаць усталяваньне бюсту, які ня мае статусу дзяржаўнага помніка, а зроблены на ахвяраваньні прыватных асобаў.

Справу разьбяруць у праваслаўным Экзархаце пасьля 13 сьнежня, калі ў Беларусь вернецца мітрапаліт Філарэт. Праз раённых перастрахоўшчыкаў нарабілася клопату і аўтарам праекту, і царкве.

**Вераніка Дзядок**



АРЦЁМ ЛЯВА

## Жахлівы Шалкевіч



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**П’еса была наступная.** Новая ўлада, сабраўшы ўвесь народ, усе 10 мільёнаў на новым чыгуначным вакзале, праводзіць мітынг. На ім судзяць апошняга дыктатара. Яго выцягваюць на сцэну прыкутым да танка. Ён голы. Народ сьвішча, б’е яго хто чым — нагамі і камянямі. А ён, у сваю чаргу, кідае ў натоўп сваім калам. Новы прэзыдэнт пытае: што будзем зь ім рабіць? Натоўп адказвае: «Сьмерць яму». Пасьля гэтага танк заяжджае на спэцыяльны цягнік і адпраўляецца ў кірунку Горадні. Новы прэзыдэнт кажа: расейцы, крок наперад. Чатыры мільёны робяць крок. Ён кажа: «Вон нахрэн атсюда ў сваю Расею». Пасьля гэтаксама дэпартуюць палякаў і астатніх. Габрэй знаходзіцца толькі адзін. Раптам прыходзіць тэлеграма з-пад Маладэчна, што дыктатар уцёк. Новы прэзыдэнт рэціруецца з ключамі ад залатога запасу. Народ дабівае расейцаў, што не пасьпелі ўцячы, і разбрыдаецца па хатах. Такую п’есу ва ўласным чытаньні разам з новымі песьнямі прэзэнтаваў на канцэрце 5 сьнежня Віктар Шалкевіч.

Гэта было жахліва. Гэта быў сапраўдны Шалкевіч. Заля была поўная. Маладзейшыя сьмяяліся, старэйшыя ніякавата аглядаліся па баках. Скончылася авацыямі.

**Андрэй Лянкевіч**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Паласатая куфайка не ўзбуджае



Судовы працэс над нямецкім канібалам, які трэскаў добраахвотнікаў, і вынікі выбараў ў расейскую Думу — фэномэны адной і той жа геданічнай практыкі.

**Паводле вучэньня фройдамарксістаў, падтрымка партый, якія выступаюць за рэжым моцнай рукі, і жаданьне пайсьці на халадзец можа тлумачыцца адным і тым жа завуаляваным прынцыпам садамазахічнага задавальненьня.** У абодвух выпадках узбуджэньне адбываецца за кошт акцэнтаваньня на сытуацыі пакутаў. Ахвяра нямецкага людаеда ішла на сьмерць, смакуючы наперад, як ёй адрэжуць пэніс і засмажаць яго з часныком. Расейскі выбаршчык упадаў у электаральны экстаз, канструюючы ў падсьвядомасьці вобразы Чубайса, які пакутуе на нарах, і згвалтаванай амэрыканцамі Радзімы.

Калі эратычная афарбоўка Радзімы-маці яшчэ зразумелая, дык вобраз лідэра РАТ «АЭС» у паласатай куфайцы, які гэтак смакуецца расейцамі ды выклікае акт глыбокага задавальненьня і нават нейкага ўзвышэньня, мне асабіста чужы і незразумелы. Атрыманьне амаль сэксуальнага задавальненьня ад пакутаў лібэрала (лібэраласадафілія), відавочна, зьяўляецца новай фазай разьвіцьця расейскай камасутры, невядомай нам, цёмным людзям на балоце. Спрабаваў узбудзіцца, малюючы ў думках Лябедзьку ў эратычнай топ-целагрэйцы, аднак арганізм усе фантазіі рашуча сабатаваў.

На шляху інтэграцыі, побач з праблемамі прыватызацыі «Белтрансгазу» і ўвядзеньня адзінага грашовага сродку, узьнікла новая — розныя вэктары сэксуальнай актыўнасьці. Ці здольны братэрскія славянскія народы аб’яднацца без адзінай сыстэмы сэксуальнай кампэнсацыі?

Вырашыць праблему можна двума сродкамі. Паводле Эрыха Фрома, дэструктыўнасьць пераадольваецца рацыяналізацыяй. Мадэль камунізму і ёсьць неабходнай рацыяналізацыяй — грамадзтва, пабудаванае на ідэях братэрства, роўнасьці і шчасьця. Аднак, баюся, ідэі адмены грошай, роспуску войска і паліцыі, перадачы ўлады мясцовым саветам і іншыя прыбамбасы камуністычнай фармацыі «бацьку» не спадабаюцца.

Адзіны спосаб ліквідаваць сэксуальную палярызацыю славянаў — даручыць Анатолю Чубайсу правесьці ў Беларусі энэргетычную рэформу. «Руды шэльма» хутка прывучыць нас да вэерных адключэньняў сьвятла, стоадсоткавай аплаты за ЖКГ, тэхнікі бясьпекі пры карыстаньні буржуйкамі і газьнічкамі, сынхранізуючы такім чынам флюіды расейскіх і беларускіх Я і Яно.

Магчыма, яшчэ ня ўсё загублена ў нашай сэксуальнай адукацыі. Веру: яшчэ прыйдзе дзень, калі навіна аб арышце удзельнікаў пікету АГП заменіць беларусам пігулку віягры і кліп «Тату».

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Пазытыў на ўзроўні дзяржавы



Свая махровая бюракратыя, свае дубовыя сілавікі, свая лжывая інфапрастора...

**Ехаў днямі ў аўтобусе — дзіву даваўся! Сталыя людзі хорам бэсьцяць Лукашэнку: што шапікі з рыбай прыбраў; што па банан унуку вымушаныя на Камароўку ехаць; за кватплату; за пэнсію...** Маладзейшыя толькі пасьмейваюцца: гэтыя ж самыя бабці й дзяды раней найперш Лукашэнку і «паддзержывалі» на выбарах ды рэфэрэндумах.

Цяпер упэўнена сказаць, якая сацыяльная група падтрымлівае прэзыдэнта, немагчыма: дзе-нідзе нават калгасьнікі ўжо «пераграюцца». Але ўпэўнена можна сказаць — і Лукашэнку тут ёсьць чым ганарыцца, — што частку патрыятычна настроенага электарату ён прыцягнуў.

Уявіце, шаноўныя чытачы «НН», што Лукашэнка раптам загаварыў па-беларуску. Ці шмат хто з вас тады меў бы да яго якія прэтэнзіі? Тады нават закрыцьцё Ліцэю выглядала б лягічным — банальная нэўтралізацыя Ўладзімера Коласа як палітычнага канкурэнта, больш ніякіх падтэкстаў!

Мая інтуіцыя й цьвярозы цям — самі па сабе, а задавальненьне ад незалежніцкай рыторыкі ў дзяржаўных мэдыях, ад даўно насьпелых разборак з Расеяй, ад перакрыцьця чужой «Культуры» — само па сабе. І зьвесьці гэта ў адну эмоцыю, як ні намагаюся, — марна. Сьмяяцца ці плакаць? Наракаць альбо хваліць? Ня ведаю...

Тое, як нашыя дэмсілы кладуцца пад маскоўскія праекты, як генэралы, экс-міністры ды старшыні партыяў дзяціняцца й скачуць вакол госьця другога гатунку, не захапляе. Пачынаеш шукаць пазытыву. І дзе ён? На ўзроўні дзяржавы! Свая махровая бюракратыя, свае дубовыя сілавікі, свая лжывая інфапрастора, свой недаразьвіты бізнэс, свая адсталая краіна, свой расейска-моўны правадыр. Дык жа, як той казаў, лепш у сваёй хатцы, ніж у чужым палацы.

**Вацлаў Заякоць**

# Небясьпечны сындром

## Грамадзяне Расеі, што жывуць у Беларусі, прагаласавалі за палітычныя сілы, якія выступаюць за ліквідацыю беларускае дзяржаўнасьці

Па сваіх пахабнасьці, цынізьме й хамстве гэтыя выбары не саступалі рэкляме расейскіх вытворцаў піва. Узровень палітычнае палемікі ўпаў да зямлі.

Для бальшыні паспалітага тутэйшага люду ўсё, што адбывалася ў расейскіх мэдыях, — атракцыён. *Разобраться, посадить, расстрелять...*

Расея чарговы раз пацьвердзіла свой вобраз, што складаўся стагодзьдзямі ў вачох Эўропы: простыя адказы на самыя складаныя пытаньні, уніканьне адказнасьці, нянавісьць да ўсяго незразумелага, плебейскія зайздрасьць і жорсткасьць. З тых груповак, што перамаглі цяпер у Расеі, ніводная ня клікала ў Эўропу, з путаў на свабоду, зь цемры да сьвятла... Наадварот, абяцалі сьмяротныя прысуды, абяцалі «ўсё падзяліць», абяцалі расправіцца з багатымі. Абяцалі амаль тое, што даўна праверана ў Беларусі. І не спрацавала.

Бясконцая вайна на Каўказе, тэрарызм, жахлівая сацыяльная няроўнасьць... Тое, што замерзлая, напаўгалодная, зьняважаная Расея галасуе гэтак, а ня йнакш, ня дзіва. Дзівіць тое, што прыкладна гэткім самым чынам, як і ў Расеі, разьмеркаваліся галасы расейскіх грамадзянаў, што жывуць у Беларусі. Адзінае адрозьненьне — вышэйшы, чым у Расеі, рэйтынг «Радзімы». Гэта тлумачыца эфэктам тэлебачаньня, што падае маладжавы вобраз самаўпэўненай двойкі Глазьева й Рагозіна, і малым уплывам расейскага друку, дзе ёсьць хоць нейкая аналітыка. Бо тэлевізар глядзяць усе, а расейскую прэсу ў Беларусі не паўсюль знойдзеш, дый дарагая яна.

Напрошваецца абагульненьне: для расейцаў на Ўсходзе і расейцам у Беларусі куды важнейшы імідж палітыка, чым сутнасьць яговых плянаў і справаў. Расейцы, што там, што тут, аддаюць перавагу безапэляцыйным заявам і лёзунгам, прамоўленым у катэгарычнай і агрэсіўнай форме.

Чаго ж бракуе беларускім расейцам? Адкуль тут набралася столькі пратэставага электарату? Ня мерзнуць жа, не сядзяць безь сьвятла. Улічваючы, што сацыяльныя праблемы для расейскіх грамадзянаў у Беларусі не на першым месцы, варта меркаваць, што ім даспадобы прыйшліся акурат нацыяналістычныя лёзунгі. Усе чатыры палітычныя сілы, што выйшлі лідэрамі на расейскіх выбарах у Беларусі, — аднязначныя прыхільнікі ліквідацыі беларускае дзяржаўнасьці. Вынікае, што грамадзяне Расеі, што жывуць у Беларусі, прагаласавалі за далучэньне да Расеі. Як тыя Ямелі на печы, яны хочуць, нікуды ня кратаючыся, апынуцца ў суседняй дзяржаве.

**Вынікі галасаваньня грамадзянаў Расеі, што жывуць у Беларусі**

| | |
|---|---|
| «Адзіная Расея» | 39% |
| «Радзіма» | 13% |
| ЛДПР | 9,8% |
| КПРФ | 9,3% |

У галасаваньні ўзялі ўдзел 4620 чалавек.

Небясьпечны сындром. Сваёй аднадушнасьцю расейскія выбаршчыкі ў Беларусі прадэманстравалі беларусам, што нашая дзяржаўнасьць для іх — усё яшчэ часовая прыкрая акалічнасьць. Дарэчы, сярод расейцаў Эстоніі ці Ўкраіны працэнт галасоў за «Радзіму» й Жырыноўскага быў яшчэ вышэйшы.

Пры такіх сымпатыях ня дзіва, што па аднамандатнай акрузе беларускія расейцы галасавалі за Ўладзімера Брынцалава, родам з Каўказу, скандальна славутага «новага рускага», клясычнага нуварыша, які скалаціў капітал на гандлі лекамі. У палітыцы ён зьдзейсьніў не адзін круты віраж, пачынаючы ад членства ў КПСС, праз розныя выбарчыя блёкі ажно да стварэньня ўласнай «Расейскай сацыялістычнай партыі», з усё тым жа прысмакам вялікадзяржаўніцтва.

Перад намі паўстала старая Расея, што адрынула ўсе тыя каштоўнасьці лібэралізму й дэмакратыі, якія паўтара дзясятка гадоў спрабавалі там прышчапіць.

Таму й супадаюць цяпер ацэнкі беларускіх аналітыкаў. Незалежна ад іхнага дачыненьня да паноўнага ў Менску рэжыму. Ілюзіяў не засталося.

**Сяргей Харэўскі**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Паслухмяная Дума

## Дэмакраты ў Чырвонай кнізе. Вынікі выбараў у Расеі

«Навіны» РТР, насуперак усім законам, проста ў часе галасаваньня паўтаралі, што перамога «Адзінай Расеі» не выклікае сумневаў. Так яно і сталася. «Адзіная Расея» — несумненна правая партыя. Але ні ў кога не павернецца язык назваць яе «заходніцкай». Заходнікі зьніклі з расейскае палітычнае сцэны. Як і наша нацыянальна-дэмакратычная апазыцыя 90-х, заходнікі мерыліся «падцягнуць грамадзтва» да свайго ўзроўню. Прыстасоўвацца да выбарца яны лічылі справай нявартай. Вынік фатальны.

Партыя ўлады, «Адзіная Расея», атрымала ўпэўненую перамогу (37% галасоў). Неспадзяванкай стаў посьпех папулістаў-нацыяналістаў з створанага тры месяцы таму адміністрацыяй Пуціна блёку «Радзіма» (9%) і чарговы ўзьлёт скандаліста Ўладзімера Жырыноўскага (12%). Разам «АдзРа» і яе саюзьнікі-нацыяналісты здабылі па-над дзьве трэціны мандатаў, што дае ім магчымасьць уносіць любыя зьмены ў канстытуцыю.

Як кіраўнікі «Радзімы», так і Жырыноўскі ня лічаць беларусаў і ўкраінцаў асобнымі нацыямі, дарэчы. «Мая пазыцыя… простая: мы мусім узьядначыцца. Мы падзеленая нацыя» (Сяргей Глазьеў). «Маё стаўленьне да Вашай краіны [Украіны] такое ж, як да сваёй жонкі» (Дзьмітры Рагозін).

Камуністы засталіся другой па памеры фракцыяй у Думе (53 дэпутаты), але ў іх болей няма надзеі на месцы ўплывовых кіраўнікоў камісій. У іх няма надзеі ўвогуле. Гэта капут для камуністаў у іх цяперашнім выглядзе.

**Вынікі галасаваньня па партыйных сьпісах**

| | |
|---|---|
| «Адзіная Расея» | 37,1% |
| КПРФ | 12,7% |
| ЛДПР | 11,6% |
| «Радзіма» | 9,1% |
| «Яблык» | 4,3% |
| СПС | 4,0% |
| Аграрнікі | 3,7% |
| Партыя пэнсіянэраў | 3,1% |

### «І сэрцу трывожна ў грудзях»

Пуцінцаў у Думе больш, чым здаецца. Бо «незалежныя» самавылучэнцы, якія прайшлі ў ніжнюю палату Думы ў аднамандатных акругах (іх 65), заўсёды ахвотна далучаліся да партыі Крамля. Незалежныя — гэта бізнэсоўцы й чыноўнікі, што не маглі б выйграць пад шыльдай «АдзРа» ў тых рэгіёнах, дзе гэтая «стабілізуючая сіла» ня можа забясьпечыць людзей сьвятлом і вадой у дамах. Да таго ж, паўторнае галасаваньне ў васьмёх выбарчых акругаў, дзе перамог кандыдат «супраць усіх», спалучаць з прэзыдэнцкімі выбарамі 14 сакавіка. Гэта «жалезна» дадасьць у Думу праўрадавых дэпутатаў.

**Расклад месцаў, Дума 2003—2007**




У выніку «АдзРа» будзе мець у Думе ня менш за 280—290 уласных дэпутатаў і яшчэ 60—70 апэрэткавых нацыяналістаў. Пуцін за чатыры гады падмяў пад сябе ўсе галіны ўлады, і на расейскім даляглядзе не відаць нікога, здольнага кінуць яму пальчатку.

Што паказальна, на Чукотцы губэрнатара-мільярдэра Абрамовіча толькі «АдзРа» і Жырыноўскі набралі болей за 5 працэнтаў.

Зраўнаваліся Масква і рэгіёны. У былым бастыёне дэмакратаў «АдзРа» атрымала 35% галасоў. На другім месцы ідзе «Радзіма» з 15%, а «Яблык» і СПС разам сабралі тамака ўсяго 17%. Здаецца, такія ж тэндэнцыі прасочваюцца і ў Менску ў параўнаньні з рэгіёнамі Беларусі.

Працяг на старонцы 5.

### Яны не прайшлі

Шандыбін, Лігачоў, Лук’янаў (КПРФ), Кавалёў, Яўлінскі, Лукін («Яблык»), Нямцоў, Хакамада, Чубайс (СПС).

### Яны прайшлі

Макашоў (нацыяналіст), Селязьнёў (экс-сьпікер), Хінштэйн (журналіст), Кабзон (сьпявак), Няўзораў (журналіст-шавініст), Затулін, Брынцалаў, Шакум («Адзіная Расея»).

### На Смаленшчыне

На Смаленшчыне ў абедзьвюх акругах перамаглі кандыдаты ад «партыі ўлады» — сябар Рады Фэдэрацыі Сяргей Антуф’еў і прадпрымальнік Віктар Дзеранкоўскі.

### «АдзРа»

«Адзіная Расея» адмовілася ўдзельнічаць у тэледэбатах. І паказальныя вынікі дало апытаньне, праведзенае перад выбарамі. У людзей пыталіся, якая партыя была найбольш пераканаўчаю ў часе дэбатаў? Бальшыня адказала: «Адзіная Расея».

# Як быць папулярным

«Адзіная Расея» — крамлёўскі праект 1999 г. Яе прадстаўнікі (чыноўнікі-бізнэсоўцы) складаюць толькі адзін, хаця і самы шматлікі эшалён вылучэнцаў з боку прэзыдэнта Расеі. Сёлета экспэрымэнт быў паўтораны. За тры месяцы перад выбарамі быў створаны блёк «Радзіма» на чале зь «печчай птушкай Крамля» Дзьмітрыем Рагозіным. Гульня «Радзімы» на электаральным полі КПРФ дазволіла Крамлю расьціснуць сваіх левых апанэнтаў. Камуністы атрымалі ўдвая меніш галасоў у параўнаньні з папярэднімі выбарамі.

Але самым доўгатрывалым праектам крамлёўскіх паліттэхнолягаў зьяўляецца вэтэран палітычнай сцэны ЛДПР. Парлямэнцкая фракцыя створанай як «пудзіла» для Захаду партыі Жырыноўскага заўсёды галасавала так, як было трэба прэзыдэнту. У выніку выбараў Расея атрымала паўтарапартыйны парлямэнт.

Маючы паслухмяную большасьць, Пуцін можа правесьці любы закон, унесьці зьмены і папраўкі ў Канстытуцыю Расеі. Па сутнасьці, пры цяперашнім раскладзе Дума мала чым розьніцца ад найвышэйшага заканадаўчага органу краіны, якая знаходзіцца на захад ад Масквы. Той краіны, якую Расея неаднаразова «вучыла дэмакратыі» і якой ставілі ў прыклад «расейскі шлях да дэмакратыі».

### Тэхналёгіі і інстытуты

Няма вялікіх адрозьненьняў і ў тэхналёгіях, якія выкарыстоўваюцца дзеля атрыманьня патрэбнага складу дэпутатаў. Наглядальнікі ад АБСЭ адзначаюць «скажэньне» вынікаў выбараў праз выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу на карысьць «Адзінай Расеі», а таксама яўную перавагу прыхільнікаў Крамля ў інфармацыйнай прасторы.

Спачатку быў усталяваны мяккі, але плённы кантроль над буйнымі электроннымі СМІ. Пасьля «чацьвертай улады» прыйшла чарга ўлады заканадаўчай — парлямэнту. Паступова адбывалася разбурэньне «сыстэмы стрыманьня і супрацьвагаў», канцэнтрацыя рэальнай улады ў руках прэзыдэнта Расеі. Інстытуты прадстаўнічай дэмакратыі і грамадзянскага кантролю над уладай гублялі сваё значэньне, атрымлівалі статус палітычных васалаў Пуціна.

### Ня Пуціным адзіным

Было б памылкай казаць, што за зьменамі характару адносінаў паміж інстытутамі палітычнай сыстэмы Расеі стаіць адзін Пуцін. Бачаньне Пуціна, яго пляны, інтарэсы яго атачэньня ня ёсьць першаснай крыніцай аўтарытарных тэндэнцыяў. Гэтыя тэндэнцыі маюць аб’ектыўны характар.

Расклад палітычных сілаў у Дзяржаўнай Думе ёсьць адбіткам крыніцы ўлады ў Расеі — яе народу. На выбарах у расейскі парлямэнт зазналі паразу ня толькі не заўжды салідарныя з Пуціным лібэралы — «Яблык» (4,3%) і СПС (4%). Зазналі паразу ўсе, хто разважаў аб грамадзянскай супольнасьці, незалежнасьці СМІ, інстытутаў судовай улады, парлямэнту, падзеле ўладаў у Расеі. Пацярпелі паразу ўсе тыя, хто разважаў аб магчымасьці будаваньня ў Расеі дэмакратыі, аб эўрапейскім пакліканьні вялікай эўраазіяцкай краіны.

Ідэям лібэральнай дэмакратыі спачувае вельмі малая частка расейскага электарату. Пераважная большасьць на мінулых парлямэнцкіх выбарах галасавала за асобу Пуціна і за парадак, справядлівасьць (у яе расейскім традыцыйным разуменьні), за пакараньне «ўнутраных ворагаў», у якасьці якіх гэтым разам выступалі алігархі і чачэнцы.

Вынікі галасаваньня толькі засьведчылі тое, што даўно вядома. Расея ня мае дэмакратычных традыцый. Лібэральныя ідэі ня маюць падмурку ў расейскім мэнталітэце. Расейская дзяржава і грамадзтва будаваліся на фундамэнце традыцый дэспатычнай улады. Разуменьне ўлады закону, улады службовай асобы, якая мае дакладнае кола паўнамоцтваў, — гэтага няма ў масавай сьвядомасьці расейскага грамадзтва. Але ёсьць іншае — разуменьне ўлады як улады асобы. У такім выпадку адсутнічае кантроль над уладай з боку грамадзтва, адсутнічае галоўная характарыстыка дэмакратыі.

Пуцін павінен быць такім палітыкам, якім яго бачыць сярэдні расеец. Кажуць, кожны народ мае тую ўладу, якую ён заслугоўвае. Але правільным ёсьць і іншае: улада фармуецца такой, якой яе бачыць народ.

**Андрэй Ляховіч**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Фанабэрыя, уяўленьне сябе кастай брахманаў, абраных для панаваньня, прывяла СПС ды «Яблык» да палітычнай катастрофы.**

# Дэмакратычны выбар Расеі

## Павал Якубовіч пра новую Думу: «...аршином общим не измерить»

Для большасьці беларусаў цяперашнія выбары ў расейскуюДуму былі нечым кшталту тэлеканцэртаў. Людзі рагаталі з выбрыкаў Жырыноўскага, пазяхалі, калі слухалі Лапшына, і крывіліся, гледзячы на безгустоўныя ператварэньні мірнага аўтамабіліста Пахмелкіна ў баявога танкіста. Пярэстыя, але пляскатыя тэлекарцінкі не маглі даць поўнага ўяўленьня пра складаныя мэханізмы выбараў, пра буйныя драмы і дробныя трыюмфы. У адрозьненьне ад выбараў 1993 г., напрыклад, няшмат людзей у Менску ня спалі ноч, чакаючы вынікаў.

Шчыра шкада Рыгора Яўлінскага, які адной сваёй прысутнасьцю ў Думе часам вiдавочна ўздымаў інтэлектуальны ровень калегаў. Так, «Яблык» дэманстратыўна сыходзіў ад таго, каб браць на сябе адказнасьць за палітычныя рашэньні, але яго людзі часьцяком прапаноўвалі рэчы сур’ёзныя і пэрспэктыўныя. У Яўлінскага быў да таго ж свой кодэкс гонару.

А вось пра Нямцова варта сказаць некалькі цёплых словаў. Яшчэ калі на пачатку сваёй дзяржаўнай дзейнасьці ён прапанаваў чыноўнаму народу перасесьці на ніжагародзкія «Волгі», многім стала зразумела, што пры такіх, як ён, лідэрах у лібэральнай ідэі кароткае жыцьцё.

Стрыманы дырыжор выбараў, намесьнік кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта Расеі У.Суркоў сказаў ляпідарна, але вычарпальна: «Пачынаецца новая палітычная эпоха, і партыі, якія не прайшлі ў Думу, павінны ставіцца да гэтага спакойна і зразумець, што іх гістарычная місія скончаная». Гэтая тэза цалкам можа быць эпітафіяй на магільным камені...

У гэтым кантэксьце яшчэ больш наіўнымі здаюцца папулярныя апошнім часам лёзунгі кшталту «Дэмакратыя прыйдзе да нас з Расеі». Будзем лепш разьлічваць на іншыя імпартныя пастаўкі. Круты стыль, прадэманстраваны ведамствам сп.Усьцінава да грамадзяніна Хадаркоўскага, таксама мусіць стаць павучальным для «рыначнікаў» кшталту сп.Раманчука, які даводзіў даверлівай публіцы, наколькі дабрадзейны «эканамічны курс», што разьвіваецца на ўсход ад Оршы.

Дарэчы, пра Хадаркоўскага. Можна зь вялікай доляй пэўнасьці сьцьвярджаць, што пасьля выбараў інтарэс пракуратуры да гэтага пэрсанажа будзе значна страчаны. Хадаркоўскага, можа быць, нават адпусьцяць, хаця актывы «ЮКАСу» ўсё-такі падзеляць. Справядліва. То бок «па паняціях»... А не высоўвайся! Як казаў Аляксандар Салжаніцын: «Борздая вошка першай на грабеньчык трапіць». Маўчаў бы, не будаваў розных «грамадзянскіх супольнасьцяў», «незалежных мэдыяў», не дамагаўся «падзелу ўладаў», дзяліўся з кім трэба, то і быў бы як Мардашоў з Патаніным, у пашане, ня грэў бы «Матроскай цішыні». Але можа быць, вязьня прыватнага капіталу суцешыць тое, што ягоная мара спраўдзілася і ён у поўным аб’ёме паслужыў любай Айчыне. І выбары спрасьціў, і паказаў, як ня трэба сябе паводзіць ва ўмовах «кіраванай дэмакратыі».

Згадкі, вядома, заслугоўвае Уладзімер Вольфавіч. За Жырыноўскага галасуюць людзі, якія на сваім прамерзлым Сахаліне лічаць, што ён, маўляў, цяпер «дасьць чосу маскоўскім начальнікам!». Бедныя сахалінцы! Вось ужо дзесяць гадоў Уладзімер Вольфавіч кажа і робіць толькі тое, што яму загадваюць на Старой і Лубянскай плошчах. Хоць інтэрпрэтуе заданьні і натхнёна, і таленавіта. Але ў нядзелю, відавочна, разамлелы ад посьпеху, быў ён у тэлепрăграме НТВ празь меру шчырым. Упэўнены, што многіх у Беларусі перасмыкнула ад яго прызнаньняў. Пра тое, што Расеі патрэбны цар (чытай — бізун і шыбеніца), што бяз гэтага расейцы нічога ня могуць, што чым болей будуць «іўрваць электрычак», тым больш добрых шанцаў у ЛДПР. Ня ведаю, хто як, а я пасьля гэтых дзікаватых прароцтваў доўга ня мог заснуць.

Пра «партыю ўлады». Нягледзячы на ўнушальную статыстыку, «Адзіная Расея» і іншыя «крамлёўскія праекты» ня могуць лічыцца цалкам пасьпяховымі. Так, яны здольны забясьпечыць ня толькі канстытуцыйную, але і звычайную большасьць падчас прыняцьця думскіх рашэньняў. Але, як мне здаецца, у гэтым посьпеху ёсьць пэўная лягічная пастка. Палітычная канструкцыя, якую на вачох выбудаваў прэзыдэнт У.Пуцін, мае на ўвазе, як ні дзіўна, і пэўны плюралізм.

Сфармаваўшы Думу такім чынам, якім яна сёньня зьяўляецца перад усім сьветам — кансалідаванай, ідэйна аднароднай і згуртаванай вакол прэзыдэнта, — Уладзімер Пуцін будзе несьці пэрсанальную адказнасьць за ўсё, што адбудзецца ў Расеі.

Бо вельмі шмат выбарцаў, прычым ня толькі ў «глыбінцы», але і ў цалкам буржуазных гарадох, масава купіліся на просты, але ад гэтага ня менш папулісцкі лёзунг Глазьева аб «пераразьмеркаваньні рэнты». Нашым чытачам растлумачу, што Глазьеў паабяцаў: ад новага падатку, які ён нібыта абкладзе сыравінавых баронаў, кожны расеец атрымае аграмадную суму даляраў. Усяго — дваццаць пяць мільярдаў! Лёзунг прайшоў на ўра! Зь яшчэ большай верай, чым абяцаньне Лёні Галубкова звазіць на халяву ўсіх, нават самых затурканых цешчаў, у Парыж. Пры гэтым ні шчодрая на абяцанкі глазьеўска-рагозінская «Радзіма», ні добры Уладзімер Вольфавіч, што паабяцаў усеагульную амністыю для зэкаў, ні сам строгі Грызлоў ня могуць і ня будуць адказваць па рахунках сваіх перадвыбарных лёзунгаў. Гэта давядзецца рабіць У.Пуціну.

Памыляюцца тыя, хто мяркуе, што ў мінулую нядзелю бескампрамісная барацьба ішла па лініі: праўрадавыя партыі («Адзіная Расея», «Радзіма», ЛДПР) і апазыцыя (КПРФ). Сапраўдная барацьба, сапраўдная кампанія толькі і пачнецца пасьля выбараў.

Розныя кланы, найперш зьвязаныя зь сілавікамі, абавязкова выйдуць на рынг супраць груп, зьвязаных зь бізнэсам.

Як заўсёды, пэўная барацьба амбіцый чакаецца вакол прызначэньня кіраўніцтва найбольш важных думскіх камітэтаў. Але гэтым разам ніякай партызаншчыны і сюрпрызаў не чакаецца: сп.Грызлоў і Кацянкоў хутчэй за ўсё маюць узгодненыя дзе трэба адпаведныя сьпісы. Усё пройдзе арганізавана... Лёгкі бунт магчымы з боку «Радзімы»: там ёсьць некалькі асоб патрабавальных, але ўсё, упэўнены, скончыцца цудоўна.

Згаданы ўжо Уладзіслаў Суркоў сказаў так: «Да выбараў гэта было зразумела нешматлікім, але цяпер выбарнікі паказалі, што старая палітычная сыстэма, заснаваная на марксісцкіх догмах аб правых і левых флангах, вычарпаная».

**(«Беларусь сегодня», скарочана)**

# Паслухмяная Дума

**Працяг са старонкі 3.**

### Ахвяры ўласнай фанабэрыі

Фанабэрыя, уяўленьне сябе кастай брахманаў, абраных для панаваньня, прывяла СПС ды «Яблык» да палітычнай катастрофы. Ніхто ня будзе галасаваць за цябе на дэмакратычных выбарах толькі таму, што ты называешся «дэмакратам». Састарэлы Яўлінскі і зьненавідны Чубайс былі ня тымі лідэрамі.

Чубайса паклікалі, бо не былі пэўныя ў сабе, баяліся, спадзяваліся толькі на грошы. Дэмакраты называлі арышт Хадаркоўскага новым 1937-м годам і атрымалі па сваім клікушстве. Барацьба СПС з «чырвона-карычневай чумой» была стратэгіяй страху, арыентаванай толькі на вельмі вузкую частку маскоўскай інтэлігенцыі. Маскоўскія клікушы настолькі часта палохалі публіку «фашызмам», «дыктатурай» і іншымі малапрыемнымі рэчамі, што людзі перасталі на гэта рэагаваць. Рыхтык як на беларускіх клікушаў, што таксама любяць крычаць «воўк!».

Камуністы ж трапілі ў іншую пастку. Ня менш гадоў, чым правыя пра дыктатуру, камуністы гаварылі пра фальсыфікацыі. Апазыцыйны выбаршчык урэшце не пайшоў галасаваць. Ня верыць у карысьць гэтага. Навошта выбарцу галасаваць за тых, хто ня можа абараніць яго ад фальсыфікацый?

У Расеі паступова зьнікае ня толькі надзея на дэмакратычнае чаргаваньне ўладаў, але і панятак дэмакратычнае канкурэнцыі. У найбуйнейшых, квітнеючых рэгіёнах кіраўнікоў абіралі практычна безальтэрнатыўна. Гэтак, за Юр’я Лужкова прагаласавалі 75% выбарцаў. А генэрала Громава ў Маскоўскай вобласьці падтрымалі аж 84% выбарцаў. І гэта ў эўрапеізаваным цэнтры, дзе ідэалягічныя супярэчнасьці, розныя групы інтарэсаў… Трапіць з апазыцыі ва ўладу можна, толькі перайшоўшы на службу да ўлады.

### Беларускія дэмакраты набралі б болей

Расея застаецца вельмі нацыяналістычнай краінай. Занесеных у Чырвоную кнігу дэмакратаў чакае цяжкая гульня на выжываньне. Пасьля правалу Кампартыі і катастрофы расейскіх «заходнікаў» у расейскай партыі ўлады не засталося супрацьвагаў ні ў чацьвертай, ні ў трэцяй, ні ў другой уладзе.

Калі б выбары па прапарцыйнай сыстэме з той жа ступеньню свабоды адбыліся ў Беларусі, дэмакраты набралі б болей. Але гэта слабое суцяшэньне, калі ты гэтых свабодных выбараў няможаш дабіцца.

Ня лепшым чынам выглядаюць цяпер прыхільнікі «дэмакратызацыі Беларусі праз Расею». Параза СПС — гэта і параза тых у беларускай апазыцыі, хто зацыкліўся на кантактах з СПС. Ня маем яшчэ палітыкаў у правым лягеры, якія адчувалі б свой народ як саміх сябе.

### Як адаб’юцца вынікі на лукашэнкаўцах

Выбары ў Расеі могуць прывесьці да росту зацікаўленасьці Захаду ў Лукашэнку, а Лукашэнкі — у Захадзе. Вынік у Расеі — для лукашэнкаўцаў найгоршы. Шкадлівых «праціўнікаў інтэграцыі» ў Думе не засталося. Няма кім прыкрывацца. Варта забыць і пра былыя мары аб пакліканьні цара-збаўцы Аляксандра на расейскі хаос.

На ўзмацненьне і цэнтралізацыю пуцінскай улады ў Расеі лукашэнкаўцы павінны зрэагаваць далейшым згортваньнем адносінаў з Масквой. Бо, у адрозьненьне ад камуністычнага, пераможны нацыяналістычны лягер у Расеі не чакае ад Беларусі нічога — акрамя далучэньня. Таму ніхто ня зьдзівіцца, калі неўзабаве мы нарэшце пачуем ад Гаранта канстытуцыі аб 70% насельніцтва, якія хацелі б уступленьня ў Эўразьвяз. Не было б шчасьця, ды няшчасьце паможа?

**Барыс Тумар**

### Зюганаў: выбары сфальшаваныя

**Расейскія камуністы абвінавацілі Крэмль у фальшаваньні вынікаў выбараў. Згодна з паралельным падлікам галасоў КПРФ, на шляху з рэгіёнаў у ЦВК у скрынкі было падкінута каля 3,5 млн. несапраўдных бюлетэняў, якія істотна палепшылі вынікі партыі ўлады. А яўка выбарцаў, паводле словаў Зюганава, склала не 56, а 53,5%. Камуністы пэўныя, што насамрэч і «Яблык», і СПС 5-працэнтны бар’ер пераадолелі і ў Думу праходзяць.**



## Аляксандар Лукашэнка актывізаваўся

**На сустрэчы з карэспандэнтам нямецкага часопісу «Шпігель» прэзыдэнту давялося адказваць на пытаньні пра зьніклых палітыкаў і рэфэрэндум.** Прыгадалі яму і колішняе выказваньне пра Гітлера, але Лукашэнка сказаў, што такога ён не гаварыў. «Што Вы робіце, каб не паўтарыць лёсу Мілошавіча і Хусэйна?» — спыталі ў Лукашэнкі. «Нічога не раблю», — адказаў ён. І паляцеў у Сырыю. А пасьля сустрэчы з партнэрам па «восі зла» Башарам Эль-Асадам накіраваўся ў Жэнэву, дзе бярэ ўдзел у сусьветным саміце па інфармацыйнай супольнасьці. Саміт наведаў і прэзыдэнт Зымбабвэ Робэрт Мугабэ, які ўжо 14 чалавек судзіў за распаўсюд праз Інтэрнэт антыўладавых заклікаў.



## Зьезды БНФ

**14 сьнежня пройдзе зьезд Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ, а 20 сьнежня зьбярэцца зьезд Партыі БНФ.**

На зьезьдзе апошняй разгорнецца канкурэнцыя за пасады намесьнікаў старшыні. Сярод прэтэндэнтаў — Галіна Сямдзянава, Юры Хадыка, Аляксей Янукевіч, Алесь Міхалевіч. А намесьнікаў застанецца ўсяго тры. Адначасова Анатоль Фёдараў (Магілёў) і Алесь Астроўскі (Горадня) маюць намер прапанаваць альтэрнатыўную стратэгію дзейнасьці партыі. Аднак на абласных сходах іх падтрымлівае меншасьць сяброў БНФ.

Унутраная дыскусія чакаецца і на зьезьдзе кансэрватараў. Там маюць свой погляд на сытуацыю ў партыі Анатоль Крыварот і Валянціна Мароз. На зьезьдзе дысыдэнты могуць пазбавіцца партыйных пасадаў.





**У Менску 10 сьнежня актывісты праваабарончах арганізацый адзначылі Сусьветны дзень правоў чалавека Ланцугом памяці зьніклых палітыкаў.**

# Гранты на сэмінары забароненыя

8 сьнежня пачаў дзейнічаць дэкрэт №24 «Аб атрыманьні і выкарыстаньні замежнай бязвыплатнай дапамогі». У пералік відаў дзейнасьці, на якія забараняецца атрыманьне замежнай дапамогі, трапіла арганізацыя сэмінараў і агітацыйных мерапрыемстваў.

Паводле дэкрэту, усе прыватныя асобы мусяць дэкляраваць падчас увозу ў краіну грашовыя сродкі, калі гэтыя сродкі будуць выкарыстоўваца ў якасьці замежнай бязвыплатнай дапамогі. Замежныя грамадзяне, якія даюць дапамогу, могуць быць дэпартаваныя з краіны. За аднаразовае парушэньне дэкрэту грамадзкія арганізацыі могуць быць ліквідаваныя ў судовым парадку, а праца прадстаўніцтваў замежных і міжнародных арганізацый — спыненая. Паўнамоцтвамі кантролю, акрамя КДК, МУС, Міністэрства па падатках і зборах, надзяляюцца яшчэ КДБ і Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, якое мае таксама вызначаць парадак рэгістрацыі замежнай дапамогі, яе памеры, мэты выкарыстаньня і магчымыя льготы.

Новы дэкрэт мае ліквідаваць шчыліны дэкрэту №8, прынятага перад выбарамі’2001. Ён, у прыватнасьці, ускладніць падрыхтоўку назіральнікаў і трэніраваньне камандаў кандыдатаў.

Дэкрэт №8 выклікаў у свой час дружны пратэст грамадзкіх арганізацый. Цяпер НДА маўчаць: прыстасаваліся да нелегальнасьці. Сэмінары можна праводзіць і за мяжой, замежных грамадзянаў дэпартавалі і раней. А перавозячы грошы праз мяжу, хто ж прызнаецца, для чаго яны прызначаныя? Адзіным вынікам дэкрэту можа стаць тое, што дзяржава пазбавіцца тых 10—30%, якімі абкладаліся ўсе легальна зарэгістраваныя ў Беларусі гуманітарныя праграмы.

**Вераніка Дзядок**



## Высоцкі прадстаўляў Беларусь

**Кіраўнік незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды Сяргей Высоцкі прадстаўляў Беларусь на сьвяткаваньні 60-е гадавіны 1-й канфэрэнцыі паняволеных народаў.** Падпольную канфэрэнцыю пры канцы лістапада 1943 г. ладзіла Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў, у ёй бралі ўдзел прадстаўнікі нацыянальных рухаў трынаццаці народаў СССР. Беларусь тады прадстаўлялі сябры Беларускай незалежніцкай партыі. Сёлета ва Ўкраіну, на Ровеншчыну, зьехаліся палітычныя пераемнікі ўдзельнікаў той гістарычнай канфэрэнцыі.





## КПБ чакае сыгналу

**Першы сакратар Камуністычнай партыі Беларусі (ня блытаць з ПКБ) Валеры Захарчанка сустракаўся з прэзыдэнтам.** Для чаго? Ці не зьбіраецца КПБ ініцыяваць рэфэрэндум? «Не. Гэта глупства, — кажа В.Захарчанка. — У апошні час прэзыдэнт некалькі разоў казаў, што ніякага рэфэрэндуму ня будзе. Сёньня няма такога пэўнага настрою». А калі б прэзыдэнт прапанаваў? Тады б і спрэчак не было: «Мы падтрымліваем прэзыдэнта. Калі б паўстала такое пытаньне, мы б падтрымалі яго і тут».

Як паказваюць сацыялягічныя апытаньні НІСЭПД, толькі пятая частка беларусаў хацела б працягу паўнамоцтваў А.Лукашэнкі. Афіцыйнае меркаваньне прэзыдэнтуры, выказанае ў інтэрвію «Шпігелю»: «А.Лукашэнка ня будзе балятавацца на трэці тэрмін, калі асобныя людзі не разгайдаюць сытуацыі».

**Алег Тачоны**

# Бжазінскі пра Беларусь

Сёньня мы ўваходзім у трэцюю фазу геапалітычнага пераўтварэньня Эўропы пасьля распаду СССР. Першая фаза — я назаву яе «Варшаўскім раўндам» — была закліканая ліквідаваць найбольш відавочную і злашчасную спадчыну «халоднае вайны» праз уключэньне Польшчы, Вугоршчыны ды Чэхіі ў NATO. Працягам названага працэсу стала другая фаза, якую па аналёгіі можна назваць «Віленскім раўндам». Прычым пашырэньне Паўночнаатлянтычнага хаўрусу супала з аналягічным працэсам пашырэньня Эўразьвязу. Трэцяя фаза, у якую нам неўзабаве давядзецца ўступіць, — я назаву яе «Кіеўскім раўндам» — вымагае ад нас прасоўваньня ў шмат менш знаёмай нам прасторы, дапускаючы большую гістарычную і сацыяльную нявызначанасьць. Аднак, мяркую, існуюць важныя гістарычныя і геапалітычныя матывы, якая падмацоўваюць нашае бачаньне будучыні Паўночнаатлянтычнага хаўрусу як супольнасьці народаў, што жывуць на тэрыторыі, якая пераходзіць межы «Віленскага раўнду» экспансіі.

Украінскі народ заслугоўвае ўласнага месца ў гэтай супольнасьці, калі ён сам таго захоча. Калі яны прадэманструюць-такі сваё жаданьне, мы проста абавязаныя зрабіць крок у адказ. Дакладна такія самыя пляны — якімі б непраўдападобнымі яны ні здаваліся — тычацца й Беларусі.

Мы ня можам дакладна ведаць, якая будучыня чакае ў гэтым кантэксьце Беларусь; я не зусім пэўны, ці нам ставіцца да Лукашэнкі, як ставіліся пасьля 1981 г. да Ярузэльскага, які разам з усёй сыстэмай зазнаў астракізму, альбо як да Чаўшэску ў 1970—80-я, якога мы ўсяляк прынаджвалі і заахвочвалі. Мабыць, зважаючы на ўсе сёньняшнія рэаліі, трэба спалучаць абедзьве гэтыя практыкі.

**З выступу на канфэрэнцыі «Стратэгічныя праблемы новае Цэнтральнае і Ўсходняе Эўропы» ў Варшаве; цытуецца паводле www.naviny.by**




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

# Даеш ВУП на 20%

## Сакрэты росту

Калі браць рост валавога ўнутранага прадукту (ВУП), дык Беларусь можна сьмела лічыць краінай з найбольш дынамічнай экономікай у рэгіёне. Мала таго, што мы нагналі ўзровень 1990 г., дык налета, згодна з загадам Лукашэнкі, ён мае вырасьці яшчэ аж на 10%. Дагонім і перагонім, адным словам.

Лічба 10% узятая са столі і мае выключна прапагандысцкае значэньне. Як яе дасягнуць? Найпрасьцейшы спосаб — маніпуляцыя індэксамі «параўнальных цэнаў» (бо індэкс росту аб'ёму вытворчасьці разьлічваецца ў параўнальных цэнах, г.зн. цэнах пэўнага базавага году). Ужо на ўзроўні прадпрыемства, а потым і гораду, вобласьці эканамічны рост мае ў вялікай ступені статыстычны, а не рэальны характар.

Аднак нават калі б наша экономіка і сапраўды вырабіла налета на 10% больш тавараў і паслугаў, ад гэтага ёй стане толькі горш. 35% беларускіх прадпрыемстваў — стратныя. Рост выпуску на стратных прадпрыемствах — гэта павелічэньне іх стратаў. Калі тона цукровых буракоў прыносіць калгасу страты ў 13%, дык налета, вырасьціўшы, згодна з заданьнем, 1,2 тоны, калгас страціць на 20% болей. Дзе ж тут карысьць для экономікі?

Калі ў эканамічнай сыстэме функцыянуюць хранічна стратныя прадпрыемствы, паскарэньне эканамічнага росту можа выклікаць толькі пагаршэньне агульнага стану экономікі.

Арыентуючыся на валавыя статыстычныя паказьнікі (рост сярэдняга заробку, ВУП), улады займаюць выгодную пазыцыю. Бо нацягнуць статыстычныя паказьнікі нескладана. Куды больш складана падвысіць рэальны дабрабыт беларусаў — тое, пра што ўлады краіны мала клапоцяцца.

**Дамінік Міхайловіч**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Бюджэт прадугледжвае рост заробкаў

**Палата прадстаўнікоў 83 галасамі супраць двух прыняла ў першым чытаньні праект бюджэту на 2004 г.** Яго прыбыткі заплянаваныя ў памеры 13,2 трлн руб., выдаткі — 13,9 трлн. Заплянаваны аб'ём дэфіцыту 690 млрд руб. (1,5% ад ВУП). 48,2% ад агульнага аб'ёму выдаткаў пойдзе на выплату заробкаў, пэнсіяў і стыпэндыяў. У 2003-м на гэта было выдаткавана 37,7%.

### Сідорскі ў ЭБРР

**У аўторак в.а. прэм'ера Сяргей Сідорскі наведаў Лёндан, дзе сустрэўся з кіраўніцтвам Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця.** Беларусь просіць новых крэдытаў на мадэрнізацыю гаспадаркі. Кіраўніцтва банку ўвязвае іх выдзяленьне з дэмакратызацыяй палітычнай сыстэмы Беларусі.

### У Польшчы плацяць за «хуткую»

**У Польшчы «хуткая дапамога» зараз будзе прыяжджаць бясплатна толькі ў тым выпадку, калі ёсьць пагроза жыцьцю пацыента.** Ва ўсіх іншых выпадках хворы мае зьвяртацца па дапамогу да ўчастковага. Апошні мае зьявіцца да пацыента цягам чатырох гадзінаў удзень і за дзьве гадзіны — уначы. За неабгрунтаваны ж выклік «хуткай» давядзецца плаціць.

### Працягваецца ўзьлёт замежнага гандлю

**За 10 месяцаў 2003 г. замежнагандлёвы зварот Беларусі склаў 17 млрд 260,3 млн даляраў, што на 25,1% болей, чым у аналягічны пэрыяд 2002 г.** Аб'ём замежнага гандлю з краінамі СНД павялічыўся на 26,6%, зь іншымі краінамі — на 22,6%. Беларусь экспартавала тавараў на 8 млрд, у тым ліку ў СНД — на 4 млрд 403,9 млн (54,4%), зь іх у Расею — на 3 млрд 955,3 млн. У дзяржавы па-за СНД — на 3 млрд 686,5 млн даляраў. Замежнагандлёвае сальда склалася адмоўнае, у параўнаньні з студзенем—кастрычнікам 2002 г. яно павялічылася на 379,4 млн.

### Аб'ёмы вытворчасьці «Белкамунмашу»

**За 2003 г. менскае прадпрыемства «Белкамунмаш» паставіла ў гарады Беларусі 68 тралейбусаў і 5 трамваяў.** Зь іх адпаведна 15 і 1 — т.зв. «гармонікі», падвышанай умяшчальнасьці.

### «Газпром» набыў «Дуёс»

**Узгодненая і парафіраваная дамова аб набыцьці «Газпромам» 34% акцыяў «Летувос Дуёс» («Літоўскі газ»).** Прыкладна такую ж долю маюць нямецкія кампаніі «Ruhrgas AG» і «EON Energie». Канчатковая цана пакуль не называецца.

**СМ; БелаПАН**

СПОРТ

# Ня трэнэрская справа

**Сталі вядомыя склады адборачных групаў да футбольнага чэмпіянату сьвету'2006.** Гэтым разам нашыя супернікі — зборныя Італіі, Славеніі, Шатляндыі, Нарвэгіі ды Малдовы. Толькі з славенцамі нашыя не сустракаліся ў ранейшых адборах, усе астатнія — старыя знаёмцы.

Многія адмыслоўцы лічаць, што маем шанец заняць другое месца ў гэтай групе — першае ўсё ж аддаюць італьянцам. Між тым падставы для радасьці няма й блізка. Возьмем сярэднеарытмэтычнае месца нашых супернікаў у рэйтынгу ФІФА. У мінулым адборы яно складала 42,25, і тыя самыя адмыслоўцы называлі нашую групу «групай сьмерці». Цяпер гэты паказьнік роўны 44. Розьніца невялікая. А Беларусь займае ў гэтым рэйтынгу сыціплы 84-ы радок.

Падставай для радасьці, мабыць, стала тое, што сярод наймацнейшых камандаў, якія выбіраліся з першых двух кошыкаў, «самыя-самыя» гранды нам ня трапіліся. Гэта й прадвызначыла ілюзію «слабасьці» нашай групы. Сапраўды, Італія ды Славенія — ня Чэхія з Галяндыяй (якія, дарэчы, зноў трапілі ў адну групу). Але ж з складу ўсіх астатніх кошыкаў нам выпалі, бадай, самыя моцныя каманды. Вось сумарныя вынікі гісторыі ўзаемадачыненьняў зборнай Беларусі зь цяперашнімі супернікамі па групе: у дзесяці гульнях дзьве перамогі, тры нічые і пяць паразаў. Розьніца мячоў 7—16.

Пакуль да пачатку гульняў ёсьць яшчэ час, нам нішто не перашкодзіць спадзявацца, што ў нас будзе нарэшце моцная «дарослая» каманда, што ўвальюцца новыя сілы, што «пераасэнсуюць» Саша і Вадзік…

«…Родзіну нада любіць, луччэ нада любіць Родзіну», — зноў скажа сусед, гледзячы на асьцярожную валтузьню хлопцаў у зялёна-чырвонай форме на аксамітна-зялёнай траве. Ці пасьпее іх навучыць гэтаму трэнэр? Ці не пазнавата, калі гэтаму вымушаны вучыць трэнэр?

**Аляксандар Урбановіч**

# Барацьба за выбаршчыка

**Крыху менш за год засталося да выбараў у палату прадстаўнікоў, а будучыя прэтэндэнты на мандат ужо пачалі голасна заяўляць пра сябе. Дэпутат Васіль Хрол адной сваёй заявай стварыў, як кажуць эканамісты, «пазнавальны брэнд». Прычым таму выбаршчыку, які ў Беларусі ўсё вырашае, прапанова Хрола спадабалася.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Васіль Хрол (справа) даводзіць сваім калегам, што мабільная сувязь — гэта раскоша.**

На тым тыдні з вуснаў бізнэсмэна Хрола прагучала прапанова ў стылі «рабуй нарабаванае»: няхай карыстальнікі мабільнай сувязі плацяць 20% падатку на даданую вартасьць за свае тэлефонныя размовы. На сёньня такі падатак плацяць толькі юрыдычная асобы. Хрол прапанаваў абкласьці і асобаў фізычных. Міністар фінансаў і прэзыдэнт прапанову падтрымалі.

Асноўныя аргумэнты Хрола — недахоп сродкаў у бюджэце і забесьпячэньне прагрэсіўнасьці падатковай сыстэмы. Дадзены тэрмін азначае рост падатковага цяжару для заможных людзей, каб яны па справядлівасьці дзяліліся з усім грамадзтвам. Такую ж функцыю выконвае прагрэсіўная шкала падаходнага падатку альбо акцызы на золата ці футра. Мабільныя тэлефоны, напэўна, таксама былі аднесеныя да раскошы.

На сёньня ў Беларусі каля мільёна абанэнтаў мабільнае сувязі. Дэпутат Хрол сьцьвярджае, што сярэдні месячны рахунак кожнага складае 50 тыс. руб. Насамрэч жа — каля сарака. Акрамя таго, найбольшыя рахункі якраз у карпаратыўных карыстальнікаў — у тых, за чые «мабільныя» размовы плаціць фірма, тым самым дазваляючы не эканоміць на тэлефанаваньнях. Але яны ўжо абкладзеныя ПДВ! У асноўнай масе карыстальнікі зусім не заможныя, значная колькасьць іх — студэнты. І падаражаньне прымусіць іх адмовіцца ад сотавікаў. У выніку прапанаваны падатак ударыць па найменш забясьпечаных уладальніках сотавых тэлефонаў, а зусім не па заможных.

Аднак Хрол зусім ня думаў ні пра заможных, ні пра сацыяльна агаломшаных. Ён думаў пра таго выбаршчыка, які будзе рэдагаваць сьпіс кандыдатаў ад «партыі ўлады». І гэты выбаршчык генэратара ідэяў аб напаўненьні бюджэту ўхваліў. Старшыні райвыканкамаў гэта заўважаць.

**ДМ**

# Тэст году. Пральныя парашкі

Працяг на старонцы 3.

Парашкі я купляў кардоннымі пачкамі: цана ў пераводзе на рублі за грам паміж малым пачкам і эканом-торбай розьніцца, але хацелася паспрабаваць як мага больш усяго, каб мець уласнае ўяўленьне. Штосьці раілі прадавачкі, пра штосьці добра адгукалася цешча, штосьці вабіла цаною, а дзесьці й рэкляма спрацавала.

## Сем аўтаматаў

Першымі ў мой чорны сьпіс трапілі супэртанныя расейскія «Радуга» й «Сорти». Яны не адмывалі нават сьлядоў ад кашак і какашак зь дзіцячых рэчаў. З гэтай прычыны «Зифа», «Пемос», «Дени» ды процьма іншых расейскіх народных марак па 800—900 руб. за паўкілі ў мой тэст не патрапілі. А патрапіла вось што (у альфабэтным парадку):

1. **«Ariel»**, «Procter & Gamble», АК «Навамаскоўскбытхім», Расея;
2. **«Bingo»**, «Hayat chemical industry Inc. Co.», Турцыя;
3. **«Бія»**, УП «Бархім», Беларусь;
4. **«Dosia»**, «Reckitt Benckiser (Poland) S.A.», Польшча;
5. **«E»**, «PZ Cussons Polska S.A.», Польшча;
6. **«Persil»**, ТАА «Хенкель Ужгород», Украіна;
7. **«Tide»**, «Procter & Gamble», АК «Навамаскоўскбытхім», Расея.

«Ariel» і «Tide» прадавачкі называлі самымі хадавымі. У пяцёрку хадавых, зь іх словаў, трапілі таксама «Dosia», «E» і «Bingo». Першыя чатыры маркі істотна дасталі тэлеглядачоў з блакітных экранаў — вось іх і купляюць. А «Bingo», рэкламы якога я не сустракаў, вабіць цаною.

Дзеля справядлівасьці й любові да радзімы давялося ўключыць у тэст баранавіцкі «Біяаўтамат» (усе тэставаныя парашкі прызначаныя для аўтаматычных пральных машын; яны адрозьніваюцца ад парашкоў для ручнога праньня абмежаваным пенаўтварэньнем і на 10—15% даражэйшыя). Ну, і на катэгарычнае сьцьверджаньне сябрука, які кажа, што ўжо пяць гадоў купляе толькі «Persil», набыў я й пачак «Пэрсылю».

Каб хто дапамог грашыма, можна было б размахнуцца й выпрабаваць яшчэ сёе-тое: «Omo», «Ixi», «Bonux», «Vizir», «Lanza», але фірмы, якія вырабляюць гэтыя парашкі, прадстаўленыя ў нашым тэсьце.

Возьмем калькулятар і вызначым, што з тэставанага колькі каштуе на вагу. Закупы (акрамя «Біі») рабіліся ў гандлёвым цэнтры «Імпульс», што ля Камароўкі ў Менску (у крамах звычайна працэнтаў на 10 даражэй), цэны на 23 лістапада. Бюджэтны рэйтынг — у табліцы справа.

Калі з цаною на вагу разабрацца лёгка з дапамогаю калькулятара, дык з нормай прадукцыйнасьці цяжэй і бяз вагаў не абысьціся: адны вытворцы пазначаюць прадукцыйнасьць у мілілітрах, другія — у грамах. Пасьля доўгіх перамераў я прыйшоў да высновы, што прадукцыйнасьць усіх парашкоў роўная 100 г на 4—5 кг сярэднябруднай бялізны (поўная загрузка пралкі). А надпісы на пачках — спробы заблытаць спажыўца, каб ён болей сыпаў і, адпаведна, часьцей купляў. Звычайная гаспадыня ня будзе шукаць аптэкарскіх вагаў, перш чым пачаць праць, таму для тэсту я вырашыў кіравацца аб'ёмным адмерам і адсыпаў, скарыстаўшы мерку для дзіцячага харчаваньня, роўна па 50 мл ад кожнага з парашкоў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

| Парашок | Вага пачка, г | Цана пачка, руб. | **Цана за 100 г, руб.** |
|---|---|---|---|
| 1.Бія | 500 | 1080 | **216** |
| 2.Bingo | 450 | 1400 | **311** |
| 3.Dosia | 400 | 1320 | **330** |
| 4.E | 400 | 1580 | **395** |
| 5.Tide | 450 | 2320 | **516** |
| 6.Persil | 450 | 2600 | **578** |
| 7.Ariel | 450 | 2850 | **633** |

## Сам працэс

Я дастаў з шафы сваю старую, калісьці белую, сынтэтычную футболку і, каўтаючы сьлёзы, парэзаў. Жонка тым часам рэзала сьнежную бавоўняную прасьціну. Сем кавалачкаў бавоўнянай тканіны памерам 10 на 13 см былі папарна сшытыя зь сямю такога ж памеру кавалачкамі тканіны з поліакрылавых нітак (ПАН) і падпісаныя нумарамі, каб не паблытаць.

Самы цікавы і месцамі апэтытны працэс — узорнае забруджваньне. Было ўзята адзінаццаць відаў забруджвальнікаў: бурачны сок, кава (распушчальная), сьвіны тлушч (смажылі скваркі), гарбата, алей, парэчкавае віно, соевы соўс, шарыкавая асадка, чакаляда, вадастойкі маркер і крэм для абутку. Пасьлядоўна, пасамі ўпоперак анучак, раўнамерна паўз натуральную і штучную тканіну, забруджвальнікі былі нанесеныя, акрамя асадкі й флямастэра, тонкім пэндзлікам.

Праграма праньня была абраная простая: загрузка — 1/4, працягласьць — 60 хв., тэмпэратура — 60°C, паласканьне, адціска765ньне.

## Што і як ацэньвалася

1. Эфэктыўнасьць мыцьця ацэньвалася па чатырохбальнай шкале: 1 бал — амаль не адмылася, 2 балы — адмылася слабавата, 3 балы — адмылася здавальняюча, 4 балы — адмылася цалкам.

2. Адбельваньне. Па двухбальнай сыстэме ацэньвалася ступень беласьці папраных з рознымі парашкамі анучак: 1 — добра белае, 2 — выдатна белае.

3. Пахкасьць. Па трохбальнай шкале была вызначаная інтэнсіўнасьць паху розных парашкоў. Камусьці падабаецца, каб папраныя рэчы пахлі моцна, хтосьці пакутуе на алергію, таму няхай чытачы самі вызначаюць, што лепш: 1 бал — невыразны пах, 2 — пахне ладна, 3 — пахне моцна. Парфумэрныя кампазыцыі розныя вытворцы выкарыстоўваюць дужа падобныя: усё ў цытрусавых, яблычных і сьвежатраўных матывах. Хіба што ў «Арыэлю» пах «маднейшы» й пазнавальны.

Вынікі тэсту зьведзеныя ў рэйтынг якасьці (табл. унізе).

## Такім чынам

Самыя дарагія парашкі ня вартыя сваёй цаны. Бо, паводле здольнасьці адмываць, месцамі саступаюць недарагім. А варыянт «сярэдзіны», калі пакупнік бярэ ня самае дарагое, але й ня самае таннае, рацыйны адно ў выпадку з турэцкім «Bingo».

Браты-палякі вырабляюць нешта-нейкае; ажно няёмка за NATO з гэтай нагоды. Зрэшты, гвалтам купляць «Досю» і «Е» ніхто не прымушае; тавар разьлічаны на тых, хто, абіраючы коштавую сярэдзіну, эканоміць нерадыкальна. «Dosia», да таго ж, даволі моцна пахне, а на «Е» напісана: 10% бясплатна. Хлусьня, а прыемна.

Супэртанны айчынны парашок «Бія» даў рады тлушчу і алею лепш за ўсіх астатніх (відаць, распрацаваны быў з улікам традыцыйнага рацыёну беларусаў), а хвалёны «Tide Fairy effect» па гэтым парамэтры выглядае найгорш.

Дарэчы, беларусы аказаліся спрытнымі яшчэ ў адным аспэкце: бачыў у крамах беларускі парашок «Віндо» з дызайнам упакоўкі, цалкам стылізаваным пад турэцкі «Bingo». А замест «Calgon» тыя, хто верыць у цуд выратаваньня награвальных элемэнтаў, можа сыпаць у пралку ўтрая таньнейшы гарадзенскі «Algon» (без акуляраў пачак «Калгону» ад пачку «Алгону» не адрозьніш).

Малавядомы ў нас «Bingo», удвая таньнейшы за «Ariel», лепей за славутага канкурэнта адмывае тлушч, а саступае яму ў вымываньні толькі тых забруджвальнікаў, зьнішчыць якія без кіпячэньня ці адмысловых хімічных сродкаў усё адно няма як — шарыкавай асадкі, маркера і абутковага крэму.

Туркі, падзяліўшы з расейцамі першае месца ў рэйтынгу якасьці, зь неверагодным адрывам выйграюць у бюджэтным рэйтынгу, а значыць, становяцца лідэрамі нашага тэсту.

Прадукцыя турэцкага канцэрну «Hayat» (акрамя «Bingo», гэта тавары пад маркамі «Test», «Molfix», «Molped»), паводле дадзеных з Інтэрнэту, займае 8,5% расейскага рынку мыйных і гігіенічных сродкаў. На жаль, статыстычных зьвестак па іншых краінах знайсьці не ўдалося, але «Hayat» мае збыт і ў краінах Усходняй Эўропы, і ў Нямеччыне. Так што іх малавядомасьць у нас можна патлумачыць эканоміяй на рэкляме.

Тэст пацьвярджае: па-першае, ня вер рэкляме, пакуль сам не пераканаешся ў якасьці прадукту; па-другое, ня ўсё дарагое — якаснае; і, па-трэцяе, сярод разнастайнае рынкавае прапановы заўсёды знойдзецца непрыкметная «цёмная кабылка», паставіўшы на якую, атрымаеш выйгрыш у сямейным бюджэце.

Трохкіляграмовы пачак «Bingo» за 8500 руб. — мой выбар і мая стаўка да наступнага выпрабаваньня.

Сустрэнемся праз год!

**Вадзім Карцаў**

| Парашок | Бурак | | Кава | | Тлушч | | Гарбата | | Алей | | Віно | | Соўс | | Асадка | | Чакаляда | | Маркер | | Гуталін | | Беласьць | | Пахкасьць | **Выніковы бал** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | бавоўна | сынтэтыка | | |
| **Ariel** | 4 | 3 | 2 | 2 | 3 | 2 | 4 | 2 | 3 | 2 | 4 | 4 | 4 | 4 | 2 | 1 | 4 | 3 | 1 | 1 | 3 | 3 | 2 | 2 | 3 | **68** |
| **Bingo** | 4 | 3 | 2 | 2 | 4 | 3 | 3 | 3 | 3 | 1 | 4 | 4 | 4 | 4 | 1 | 2 | 4 | 3 | 1 | 1 | 3 | 2 | 2 | 2 | 3 | **68** |
| **Tide** | 4 | 3 | 2 | 2 | 3 | 2 | 3 | 2 | 3 | 2 | 4 | 4 | 4 | 4 | 2 | 1 | 4 | 2 | 1 | 1 | 3 | 3 | 2 | 2 | 3 | **66** |
| **Persil** | 4 | 2 | 2 | 1 | 3 | 3 | 3 | 2 | 3 | 2 | 4 | 4 | 4 | 3 | 1 | 1 | 4 | 2 | 2 | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | **61** |
| **Бія** | 3 | 2 | 1 | 1 | 4 | 3 | 1 | 1 | 4 | 3 | 4 | 3 | 4 | 3 | 1 | 1 | 4 | 3 | 2 | 1 | 3 | 2 | 1 | 1 | 1 | **57** |
| **Dosia** | 3 | 2 | 2 | 1 | 4 | 1 | 2 | 2 | 2 | 1 | 4 | 4 | 4 | 3 | 1 | 1 | 4 | 3 | 1 | 1 | 2 | 2 | 1 | 1 | 3 | **55** |
| **E** | 3 | 3 | 1 | 1 | 4 | 2 | 2 | 2 | 2 | 1 | 4 | 4 | 4 | 4 | 1 | 1 | 3 | 2 | 1 | 2 | 2 | 2 | 1 | 1 | 2 | **55** |

# Кіраваньне пляшкай

**Пакуль у сталіцы грымеў чарговы тур сэмінару кіраўнікоў «Кадры кіраваньня ў сучасных умовах», пакуль там высьвятлялі, «якім павінен быць кіраўнік XXI ст.» (будзем спадзявацца, што ў стагодзьдзя будзе прынамсі некалькі кіраўнікоў), у працоўных калектывах абмяркоўвалі прэзыдэнцкія словы наконт мэдвыцьвярэзьнікаў і ЛПП.** Колькі ж гэта, маўляў, часу давядзецца ў выпадку прыкрага здарэньня займацца сельгасработамі, калі ўжо цяпер мэдвыцьвярэзьнік бярэ за свае паслугі каля 15000 руб. І ўсе рэвалюцыйныя падзеі ў Грузіі, што адбываліся ў тыя самыя дні, былі няздольныя канкураваць з гэтай тэмай.

Тыя, хто ня бачыць сябе патэнцыйным кліентам нарколяга, мелі нагоду задумацца пра нечуванае распаўзаньне гандлю алькагольнымі напоямі, якія апошнім часам зьяўляюцца ў крамах, дзе іх, мякка кажучы, не чакаеш. У кожным прадуктовым магазыне прылавак «ад зялёнага зьмея» на самым пачэсным месцы, буйныя ўнівэрсамы маюць некалькі. Нават у маленечкай хлебнай краме, дзе няма як павярнуцца, бутэлькі вабяць пакупніка ля ўваходу, і на адмысловым месцы побач з слодычамі ды мінэралкай, і проста на касе, дзе грамада купляе хлеб і булкі: «Не забыў, таварыш?!» Як казалі ў тым фільме, мы зробім вам прапанову, ад якой немагчыма адмовіцца.

Палічку з напоямі можна часам сустрэць нават у кіёску з кветкамі. Не траплялася (пакуль) хіба што ў шапіках «Белсаюздруку». І ў гэтым кантэксьце зьдзіўляюць паведамленьні пра невыкананьне плянаў збору акцызаў, пра адчувальны застой у беларускіх вытворцаў алькагольных напояў. Кіраваньне пляшкаю не на ўзроўні: піць менш ня сталі, а грошы ў бюджэт не зьбіраюцца, у вінаробчай галіне — стагнацыя. Цяжка назваць гэта посьпехам, асабліва калі штодня маеш справу з вынікамі папулярызацыі алькаголю: што ў побыце, што на працы, дзе ў кадравых пытаньнях гэта даўно праблема нумар адзін.

Паводле лёгікі, на збор «п’яных грошай», якія шмат важаць у бюджэце, павінны быць скіраваныя асаблівыя высілкі: максымальнага прыбытку трэба дасягнуць пры найменшай шкодзе грамадзтву. І першы крок тут, здавалася б, відавочны: абмежаваць усюдыіснасьць бутэлькі, не пагражаючы даступнасьці зельля. Хай ня лезе ў вочы, як цяпер, перад дзьвярыма школы, хай чалавек мае шанец набыць хлеб і малако, не пачуўшы настойлівай прапановы, — сваё вып’е, няма чаго хвалявацца. Нягледзячы на сьціпласьць і відавочнасьць гэткае лініі, рэалізуецца супрацьлеглая: гандаль віном і гарэлкай шырыцца, не прыносячы меркаваных прыбыткаў бюджэту, айчынныя вытворцы змагаюцца з адміністрацыйна створанымі перашкодамі, губляючы капітал і свой сэктар рынку, лёгкія грошы ў бюджэце адгукаюцца важкімі сацыяльнымі праблемамі.

Гучная заява пра выцьвярэзьнікі стане ў шэраг правільных і апраўданых, але хаатычных адміністрацыйных крокаў, якім дзяржаўныя СМІ намагаюцца надаваць выгляд сыстэматычнага клопату ўлады пра народ. Менавіта правільнасьць і мэтазгоднасьць рашэньняў (тычацца яны выцьвярэзьнікаў ці падатковых ільготаў, парушэньняў ва «Ўнікаштмэце» або гандлёвых надбавак, энэргетычнай бясьпекі ці аднабокай замежнай палітыкі) змушае кожны раз задаваць пытаньне, чаму відавочнае даўно ажыцьцяўляецца толькі сёньня. Абураныя галасы высокіх начальнікаў, якія даводзяць *нам*, што там і там зробленыя вялікія пралікі ў кіраваньні, правакуюць неўразуменьне: «А хіба ня *вы* гэтак накіравалі?» Недабор акцызаў і перабор прадаўцоў алькаголю можа мець супольны корань: імкненьне кіраўнікоў выцягнуць максымум алькагольных грошай у бюджэт сваёй установы ці адміністрацыйнай адзінкі. Застаецца спадзявацца, што таленавіты выкладчык на сэмінары пераканае іх, што з гледзішча агульнанацыянальных інтарэсаў гэта немэтазгодна.

**Аляксандар Карольчык**



ГАННА КАВАЛЁВА

Мы зробім вам прапанову, ад якой немагчыма адмовіцца.

## За блакітныя халаты!

**Пагаджуся з аўтарам артыкулу «Ня наш бізнэс» («НН», №45).** Раздробны гандаль, маючы вышэйшую ў параўнаньні з стацыянарным цэнаёмістасьць тавараў, здымае вяршкі. Што дамінуе ў асартымэнце шапікаў і на рынках? Цыгарэты, піва, шакаляд, жуйкі, касмэтыка, дробная электроніка... Колькі ў сярэднім каштуе кіляграм тавару ў іх? Даляраў дзесяць. І стацыянарны гандаль: хлеб, малако, цукар, мяса, трыкатаж, будматэрыялы, мэбля... Да паловы тавараў — беларускай вытворчасьці: 2—3 даляры за кг.

Пры гэтым індывідуальныя прадпрымальнікі з гандлёвай плошчай да 15 м², гандляры на рынках плацяць толькі фіксаваны падатак (200—300 эўра за месяц) незалежна ад памеру выручкі. Выручыў з трохмэтровага шапіку ў Менску 10 тыс. даляраў, а падаткаў заплаціў 2%, яшчэ 2% — арэнда, 2% — прадавачкам на заробак, 2% — чыноўніку й мянту. Астатняе — у новы тавар і сабе. Нарэгістраваў 20 ІП-шнікаў, раскінуў па горадзе з каробкамі — і праз год-другі мільянэр. Дык чаму ня жыць тут?

У стацыянарным гандлі карціна іншая: 20 падаткаў, штат з «сацыялкай», камунальныя плацяжы, амартызацыя, рамонт памяшканьня, санстанцыя, пажарныя... Яно й нічога, усім бы хапіла (гадавы аб’ём розьніцы па краіне — 5—6 млрд даляраў), каб вяршкоў не здымалі госьці зь цёплых краінаў. Ніжэйшы тавараразварот — вышэйшую надбаўку даводзіцца ставіць. У шапіку й на рынку тавараразварот 800—1000 даляраў з квадратнага мэтра за месяц, у гандлі па краіне — у сярэднім 50 даляраў. Таму ў 1995 г. адносіны арганізаванага гандлю да неарганізаванага складалі 87% да 13%, а ў 2002-м — ужо 65 да 35. Інтарэсы мясцовых гандляроў, фіскальныя дзяржаўныя інтарэсы былі парушаныя, і пакідаць сытуацыю як ёсьць — тое самае, што пахаваць культурны айчынны гандаль... А цэны ў краме ўпарадкуюцца з павелічэньнем патоку пакупнікоў, якія не патрацяць грошы ў шапіках.

Падмурак бізнэсу — традыцыя. Яна вызначае стыль працы — фактар посьпеху на рынку. Можна прыгадаць японскі бізнэс-стыль, амэрыканскі, заходнеэўрапейскі. Якія традыцыі фармуюцца ў беларускім дробным гандлі сёньня? Абважыць пакупніка? Прадаць цыгарэты дзіцяці? Сапхнуць пратэрмінаваны тавар? Даць хабар чыноўніку? Прадавачкі, маладыя жанчыны, трымцяць у жалезных каробках зімой, смажацца на сонцы ўлетку. Гэта бізнэс цаною здароўя іншых. Гэта ня наш бізнэс.

Мне патрэбныя цёплыя крамы з прадавачкамі ў блакітных халатах.

**Віктар Іваноў, асьпірант, Менск**

## Ахоўнікі апусьцелых сялібаў

**На артыкул Васіля Дубягі зь Мядзелу («НН» №24) прыпомніўся выпадак, які склаў пэўнае стаўленьне да вужакаў, што селяцца ў апусьцелых хатах.** Адбылося гэта, калі не было мне і дзесяці гадоў. Цэлае лета пад ясным сонейкам я бавіў зь сябрамі ў вёскі Кашавічы. Гулялі ў розныя забаўкі і ня ведалі й гадзіны спакою. Неяк хтосьці прапанаваў ісьці лавіць вужакаў. Пайшлі тады ў хату дзеда Дзяніса, які два гады на той момант як памёр. Невялікая хата стаяла на ўскрайку вёскі. Чорная, з забітымі вокнамі, аселай страхой, яна займела непрывабны, нават жахлівы выгляд. Дзірка ў агароджы, зарослая па пояс сьцяжынка, акно. Лезем па чарзе ўсярэдзіну.

Санька быў самы старэйшы і сьмялейшы за ўсіх, таму менавіта яму і выпаў гонар лезьці па вужаку пад адзінокую канапу, што сумна ўсталявалася каля сьцяны.

— Ай! — Санька з крыкам адхапіў руку і памчаўся да выратавальнага акенца. З-пад канапы вялікі, доўгі, з шыпеньнем выпаўз вуж і застыў у перасьцерагальнай позе. Як мы рванулі па сваіх хатах! Толькі нас і бачылі.

— Ба-бу-ля! Там у Дзянісавай хаце вужак як цапануў Саньку! — прыцiснуўся я бліжэй да бабулі.

— А што вы там рабілі?

— Мы яго злавіць хацелі, вужа гэтага.

— Дык ня просты то вужак быў, якіх у лесе шмат, то вужвартаўнік.

І бабуля, пасадзіўшы мяне побач, расказала паданьне пра вужакаў-вартаўнікоў.

— Калі гэта адбылося, ніхто дакладна ня ведае. Паміраў бацька — і яго рэчы ды багацьце, зробленыя за жыцьцё, пераходзілі да сына, а той імі і карыстаўся. Але зь цягам часу ўсё больш і больш сыноў, калі выраслі, пакідалі сваіх бацькоў ды сыходзілі ў далёкія краіны. Паміраў бацька, рэчы ды багацьце яго заставаліся без гаспадара, і расьцягвалі іх розныя людзі па сваіх хатах. Паглядзеў Бог на тое, што некаторыя толькі гэтым і жывуць, нічога ня робячы, паклікаў анёла свайго і кажа: «Хадзі на Зямлю і барані набытак сумленных людзей». Доўга разважаў анёл, у каго б яму пераўтварыцца, і вырашыў, што лепш за вужа яму не знайсьці нікога. Так і стаў ён вужом-вартаўніком. Шмат іх зьявілася з таго часу. Поўзаюць яны па апусьцелых хатах і сьцерагуць усё, што там засталося, ад зладзеяў. Няма іх толькі там, дзе нячысты чалавек жыў, дзе месца загаворанае. Вось, відаць, вас гэты вужака таксама палічыў за зладзеяў і ўкусіў Сашку, — скончыла бабуля.

Я быў вельмі ўражаны гэтым паданьнем пра вужакаў-вартаўнікоў. Зь цягам часу пачаў сумнявацца ў яго праўдзівасьці, але дакладна памятаю, як бабуля тым вечарам даўжэй малілася. Ды, відаць, ня проста так, бо нейкі нібы цяжар зваліўся ў мяне з душы пасьля яе малітвы.

**Сяргей Мацко, Горадня**

## Чупа-чупс астатніх дзён

**Дарослыя, зірнеце, калі ласка, на шапкі сваіх сыноў і дачок.** Гэтая міленькая расьліна, намаляваная на галаўных уборах, зусім не канадзкі кляновы лісточак. Гэта каноплі. Ясна, што ня ўсе дзеці будуць іх спажываць, але сытуацыя сымптаматычная. Вакол канопляў нагнятаецца штучны ажыятаж. Апроч выяваў на кепках можна пабачыць адмысловыя значкі, завушніцы, аздобы на нос. Пра «траву» гаворыць уся моладзь. У некаторых школах для старшаклясьнікаў няма пытаньня, што ўжыць для рэляксацыі — піва ці гарэлку. Пытаньне «гарэлка ці каноплі» зрабілася больш актуальным.

Актыўнага інфармацыйнага супрацьстаяньня новай «модзе» не відно. А ў братоў-украінцаў ужо колькі гадоў вядзецца адпаведная кампанія. У Беларусі ж асобныя сацыяльныя ролікі аб шкодзе наркотыкаў губляюцца ў плыні рэклямы пральных парашкоў, курыных кубікаў, ультратонкіх пракладак і чупа-чупсаў на кожны дзень.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

* * *

**У мінулым нумары «НН» пісала аб Рэфармацкай царкве.** Дзе ж можна знайсьці кальвіністкую парафію?

**Анатоль Гарай, Менск**

Даведацца аб часе і месцы службаў можна праз тэл. 206-28-78, 8-0296-505-806.

## Найтаньнейшая падпіска на «НН»

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 1500 рублёў (2150 рублёў — калі падпісвацца праз «Белпошту»). Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для Вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:** вул.Валадарскага, 16, пак.302 — 227-88-41

**Пункты прыёму падпіскі:** вул.Жукоўскага, 5, корп.1 — 224-32-03
пр.Скарыны, 113 — 264-22-91
вул.Раманаўская Слабада, 9 — 220-83-04
вул.Кашавога, 8 — 230-29-20

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82, корп.2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 223-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | мэтро «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 51, корп.1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | мэтро «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 245-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |

**Шапікі**

| | |
|---|---|
| №2 | Лінгвістычны ўнівэрсытэт, вул.Захарава, 21 |
| №18 | Тэхналягічны ўнівэрсытэт, вул.Сьвярдлова, 13/4 |
| №18 | Пэдагагічны ўнівэрсытэт, вул.Савецкая, 18 |
| №78 | Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19 |
| №95 | Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39 |
| №136 | ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня |
| №187 | Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15 |
| №18 | Аўтавакзал «Маскоўскі» |
| №198 | Эканамічны ўнівэрсытэт, пр.Партызанскі, 26 |
| №209 | Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2 |
| №228 | Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17 |
| №232 | Менскі завод халадзільнікаў, пр.Машэрава |
| №245 | Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56 |
| №259 | Менскі дзяржаўны гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183 |
| №260 | пр.Скарыны, 169 |
| №262 | Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31 |
| №298 | пр.Машэрава, 75/1 |
| №302 | 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8 |
| №313 | Слабадзкі праезд, 24 |

Сяргей Дубавец

# Сакрэт Бэндэ

Лукаш Бэндэ даўно стаў увасабленьнем беларускага літаратурнага кілера сталінскае пары. Супрацоўнік НКВД, чалавек зь пісталетам на баку, крытык, чые артыкулы сеюць арышты і сьмерць... Сёлета ў лістападзе Бэндэ споўнілася 100 гадоў. Паспрабуем вярнуцца ў ягоныя цёмныя часы, зразумець тую эпоху, яе герояў і ахвяраў, і мы ўбачым яе працяг у нашым сёньняшнім жыцьці і ў нас самых. Калі Бэндэ — гэта ўвасабленьне, дык яно нікуды ня зьнікла, яно побач, яно ўсярэдзіне, яно жыве...

…1930-я гады. Камуністычная мафія кіруе ў савецкай Беларусі. «Сям’я» верыць у камунізм, як у сваю беларускую тоеснасьць. Беларус — значыць, бальшавік. Пачатак Беларусі — у 1917-м. Усе, хто гаворыць пра нешта іншае, пра ВКЛ, Каліноўскага і «Нашу Ніву», — замінаюць; лепей, каб іх не было. Мы ўсе гуляем у адну гульню і імкнёмся пазбавіцца ад чужакоў, на што маем санкцыю клясавай барацьбы. Гэта разумеюць і Янка Купала, і Якуб Колас, а лепш за ўсіх — ён, Лукаш Бэндэ, галоўны літаратурны крытык, чые газэтныя разносы цягнуць за сабой турэмнае зьняволеньне, катаргу або ссылку, самагубства або расстрэл. Мафія зьнішчае сваіх адкрытых і таемных ворагаў, выкрывае сваіх няшчырых прыхільнікаў. Бэндэ ўважліва вывучае жыцьцёвыя і творчыя біяграфіі пралетарскіх пісьменьнікаў, у шэрагі якіх запісалася занадта шмат зьбяднелых шляхцюкоў ды папоўскіх дзяцей, якіх непазьбежна хіліць у розныя дробна-буржуазныя містыцызмы-імажынізмы. Работы — непачаты край...

Ягоная ўласная біяграфія па-пралетарску простая, як стрэл. Нарадзіўся ў 1903 г. на Палесьсі, у тых мясьцінах, дзе вёскі маюць назвы, вартыя мэгаполісаў. Харомск, Ізборск... Ягоная называлася Шчакоцк. Скончыў Камуністычны ўнівэрсытэт Беларусі. Далей пачынаецца кар’ера літаратурнага крытыка. За вочы Бэндэ называлі аглабельшчыкам, але сучаснікі згадваюць, што хадзіў ён не з аглобляй, а зь пісталетам на правым баку, бо зь першых кар’ерных крокаў зьвязаў лёс з НКВД. Мабыць, адчуваў сваю місію — праўду яму давядзецца казаць у чужым, варожым асяродзьдзі.

Імя Бэндэ паміж літаратараў даўно стала назыўным. Яго самога найчасьцей згадваюць як вульгарнага сацыялягізатара, альбо і зусім проста — як літаратурнага ката́. Між тым, ня ўсё так проста ў гэтай гісторыі.

Калі Бэндэ і сапраўды — кат, дык ён назаўсёды прывязаны да сваіх ахвяраў. Мёртвым не баліць, і яны ідуць усе разам. Калі за савецкім часам было накладзенае табу на імёны і творы рэпрэсаваных беларускіх пісьменьнікаў, такое ж табу легла і на імя іхнага ката. Як толькі стала магчыма ўзьняць з забыцьця прозьвішчы забітых, сярод першых усплыло ў друку і прозьвішча Бэндэ...

«Ён нават зьнешне быў непрыемны, — пісаў Б.Сачанка ў 1988 г. у газэце «Літаратура і мастацтва». — Худы, лысы да апошняга валаса, з вачыма, што глядзелі быццам з таго сьвету і праціналі навылёт. Помню, калі, знаёмячыся, ён працягнуў мне руку і я ў адказ падаў сваю, здалося, што дакрануўся чагосьці ліпкага, агіднага — ня то цьвілі, ня то павуціньня. Ішоў 1960 год, і зь «мест не столь отдаленных» вярталіся, атрымаўшы доўгачаканую рэабілітацыю і грамадзянскія правы, многія, у тым ліку і пісьменьнікі. І, вядома ж, то адзін, то другі з рэабілітантаў заходзілі ў рэдакцыю часопісу «Полымя», дзе я тады працаваў... Завітаў неяк і ён... Ён не спытаў, як пыталі некаторыя, ці чуў я, тады яшчэ малады чалавек, яго прозьвішча. Ведаў, напэўна, што чуў. Ня мог ня чуць...»

«У 1933-м у «Звяздзе» зьявіўся артыкул журналіста Джэлюка «Дырыжор аглобляй», — кажа гісторык і архівіст Віталь Скалабан. — Зьявіўся такі тэрмін — аглабельная крытыка. Ёсьць і шарж — 1935 год, газэта «ЛіМ»: пісьменьнікі ідуць на Парнас. А ў самым канцы гэтага шэрагу якраз Лукаш Бэндэ з дубінай.

…Д’яблам ён ня быў. Ён добрасумленна выконваў тыя ўстаноўкі, якія фармаваліся ў ЦК кампартыі Беларусі. Болей за тое, многія зь яго паплечнікаў жылі пасьля вайны і ім выгадна было ўсё сьпісаць на Бэндэ.

Акрамя ўсяго іншага, Бэндэ быў калекцыянэрам, зьбіральнікам літаратурнага архіву. Ён сабраў вельмі значныя літаратурныя матэрыялы. Сёньня архіў Бэндэ зьберагаецца ў Беларускім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва. Там сапраўдныя скарбы. Там архіў Паўлюка Труса, там архіў 1930-х гадоў, матэрыялы Замоціна з тэкстамі Дуніна-Марцінкевіча, там Хрэстаматыя Браніслава Эпімаха-Шыпілы».



У нас няма падставаў папракаць Бэндэ няшчырасьцю. На гэтыя хваробы хварэлі якраз тыя, пра каго ён пісаў, — пісьменьнікі, што хвалілі сваю сутнасьць.

Калі перачытаць згаданы артыкул Барыса Сачанкі, мы знойдзем там зьвесткі, якім чынам Бэндэ фармаваў сваю калекцыю. Крытык ня толькі атрымліваў па лініі НКВД тыя матэрыялы, аўтараў якіх трэба было выкрыць у друку, але і сам удзельнічаў у ператрусах на кватэрах ахвяраў.

Можна разважыць і так: усё адно ніякі Бэндэ, як бы таго ні хацеў, ня змог бы выратаваць асуджанага на рэпрэсіі клясавага ворага. Не напісаў бы ён — напісаў бы іншы, такіх «пісьменьнікаў» хапала. І тады тое, што Бэндэ захаваў архіў рэпрэсаваных літаратараў, дзякуючы якому мы цяпер толькі і можам даведацца пра іх і прачытаць іхныя творы, — гэткі ўчынак Бэндэ выглядае ледзьве не як подзьвіг.

«Ягоныя артыкулы ня вельмі арыгінальныя, — кажа В.Скалабан. — Яны паўтараюць тое, што пісалася і іншымі аўтарамі. Ну, можа, ён быў больш малады, напорысты ў 1930-я. Уражаньне такое, што яго проста нацкоўвалі. Такіх, як Бэндэ, было шмат. Але ў сярэдзіне 1930-х гадоў ён ужо выканаў сваю ролю аглабельшчыка і яго саслалі ў Ленінград на кінафабрыку «Савецкая Беларусь».

«Падчас расправы з сотнямі вучоных, пісьменьнікаў права «караць і мілаваць» манапалізавала пэўная група, у якую ўваходзілі Барысенка, Бранштэйн, Бэндэ, Вольскі, Канакоцін, Клімковіч, Кучар, Модаль... — піша Аляксандар Лукашук у кнізе «За кіпучай чэкісцкай работай». — Іх ацэнкі рабілі «надвор’е», зь іх ліку следчыя выбіралі аўтараў рэцэнзіяў-прысудаў».

Працяг на старонцы 12.



«Дарогай на Парнас… — сяброўскі шарж Галіны Дакальскай.

— Калі ласка на Парнас! — кліча Міхась Клімковіч, трымаючы ліхтар ССПБ. Абняўшыся ідуць народныя паэты Янка Купала і Якуб Колас. Сатырык Кандрат Крапіва «натхняецца» галінкай улюбёнае расьліны. Глыбока задумаўся Міхась Лыньковў. Сьмела крочыць Цішка Гартны побач зь Міхасём Чаротам. Крытык Алесь Кучар коціць на дзіцячым вэлясыпэдзе, везучы на сябе «груз» — сябрука-паэта Аркадзя Куляшова. Дакумэнты гадоў творчае работы «вінавата» нясе Платон Галавач. Міхась Зарэцкі зьдзіўлены з рамантычнай рэальнасьці паходу на Парнас. Янка Маўр скача на пазычаным у сваіх чытачоў коніку. Зьмітрок Бядуля прыручыў звонкагалосага салаўя. Архіў матэрыялаў 1905 году нясе ў важкім чамадане Рыгор Мурашка. Драматург Ільля Гурскі вядзе шофэрам машыну беларускае савецкае драматургіі. Мацьвей Кульбак яшчэ перачытвае драматычныя прыгоды свайго героя Бойтры. Прадумвае новую п’есу Аўсьцігней Міровіч. Анатоль Вольны пэўна парашыў з кіно пераключыцца на тэатар — ён трымае тэатральныя маскі. Уладзімер Глазырык умясьціўся ля Рыгора Кабца. Прызвычаены вандраваць Уладзіслаў Галубок грае на баяне, але рыкашэт вясёлай музыкі не выводзіць з задумы Васіля Сташэўскага. Згуртаваным атрадам ідзе літаратурная моладзь — Эдзі Агняцьвет, Гелена Раманоўская, Васіль Каваль, Барыс Мікуліч, Янка Скрыган, Хвядос Шынклер, Сымон Баранавых, Эдуард Самуйлёнак, Сяргей Знаёмы. На легкавой машыне абганяе калёну Пятрусь Броўка. Сьледам крочыць Уладзімер Хадыка. Аваладаў тэхнікай матацыклу Пятро Глебка. Прапэлерамі ўзброіўся Мікола Хведаровіч — для хуткасьці. Цодзік Даўгапольскі прытаміўся і здагадаўся наняць возьніка. Маратонскім бегам сьпяшаецца Майсей Тэйф, яго падганяе Зэлік Аксельрод. «Тут багата відаў транспарту», — зьдзіўлены сатырык Лейзар Кацовіч. Зь ліхтаром разглядае крытык М.Модэль спэцыфіку зьяў. Паэтыка не пакінула тут і прафэсара Якава Бранштэйна. Крытык Бэндэ ня можа разлучыцца з арсэналам свае крытычнае зброі. Магутна гудуць прапэлеры. Гэта Андрэй Александровіч і Ізі Харык навыперадкі сьпяшаюцца на Парнас. Зьлева — Парнас. Узысьці на яго запрашае Максім Горкі. Пушкін дэклямуе вершы з «Полымя рэвалюцыі». Леў Талстой паглыбіўся ў газэту «Літаратура і мастацтва». Бальзак выглядае Кузьму Чорнага. Празь бінокль узіраецца Чэхаў, а Гогаль зьдзіўлены аэраплянамі. Шэкспір шукае ў калёне драматургаў». (Паводле «ЛіМу», 1935 г.)

Са збору Віталя Скалабана

# Веліч і падзеньне Івана Шамякіна

Іван Шамякін. Начныя ўспаміны. — часопісы «Полымя» і «Беларуская думка»; «ЛіМ».



Гэты твор стаў адкрыцьцём і для прыхільнікаў, і для непрыхільнікаў творчасьці Івана Шамякіна. А міжвольнае параўнаньне гэтых успамінаў з «Доўгай дарогай дадому» Быкава ды дзёньнікамі Адамчыка, іншых зь вялікай плеяды, дазваляе параўнаць, як працавалі гэтыя людзі над сабой і сваімі творамі, ды пазнаць таямніцы савецкага жыцьця.

Непрыхільнікі — а гэта пераважна моладзь, знаёмая з Шамякіным з хрэстаматыяў і таблёідаў, — будуць уражаныя беларускасьцю і інтэлігентнасьцю пісьменьніка, які мае імідж савецкага і камэрцыйнага. «Успаміны» раскрываюць сакрэт мільённых накладаў: карпатлівая праца над дэталямі і старраннае падтрыманьне кола кантактаў з абранымі — аж да ЦК. Шамякін гатовы быў у пошуку дакумэнтаў зьвяртацца да старшыні КГБ, а сюжэты зьбіраў нават у кантактах зь міністрамі. Зь іншага боку, пісьменьнік рабіў усё для прамоцыі сваіх твораў. Ён з шкадаваньнем канстатуе, што не пабываў з сустрэчамі ва ўсіх раёнах Беларусі — прамінуў Кармянскі.

Крытычны да цяперашняга кіраўніцтва (яно «страціла нацыянальны гонар»), Шамякін падкрэсьлівае, што мастацкая праўда заўжды для яго значыла болей, чым партыйная ўстаноўка.

З «Успамінаў» ён паўстае пісьменьнікам-рэалістам і маралістам. Аднак маральнасьць спыняецца там, дзе сканчаецца інтэрас сваёй, паноўнай клясы ці сваёй сям'і. У гэтым сэнсе народны пісьменьнік Шамякін быў страшэнна далёкі ад народу. Двухпакаёвыя нумары люкс, вячэры ў нумар, армянскі каньяк, саўрэстараны, «Волгі», дачы — усё, што складала баярскае шчасьце і адначасова сакрэт посьпеху, прыналежнасьці да намэнклятуры... Пра гэта бязь ценю сораму, наадварот, з гордасьцю за сябе і сваю ўдачу апавядае Шамякін. Жонкі і каханкі (ён не шкадуе чорнай фарбы, змалёўваючы другую жонку іншага пісьменьніка-мільянэра Макаёнка), што змагаюцца за міністраў, за чатырохпакаёўкі... Гэтым жыла савецкая эліта ў 50-я, калі словы «серп і молат» проста значылі для мільёнаў сьмерць ды голад, і ў 70-я, калі яны значылі ўжо проста чэргі па масла.

Сьвет Шамякіна абмяжоўваўся Савецкім Саюзам. Ён шчыра расказвае, як натуральна занемагаў, калі трапляў у заходнюю краіну. Крах СССР быў і пэрсанальным крахам Шамякіна. Ва «Ўспамінах» ён называе лічбу асабістых стратаў: 180 тыс. савецкіх рублёў ашчаджэньняў (для маладых: 250 тыс. даляраў у тагачасным курсе). Разваліўся саюз — і зьнік сьвет, які ён апісваў. Развал Саюзу для Шамякіна — і ў гэтым ён геніяльна тоесны свайму колу й пакаленьню — гэта вынік не заганнасьці сыстэмы, а апакаліптычнай змовы.

Заганы пісьменьніка Ганчара ці сакратара Зімяніна — гэта прыватныя заганы, а не заганы сыстэмы. Дыскусіі па ацэнцы камуністычнага мінулага не ўзьнікае, няма ва ўспамінах і знаку рэпрэсій, прыгнёту хрысьціянаў і меншасьцяў — усяго таго, чым былі гады красаваньня Шамякіна для *іншых* мільёнаў.

Холдынгавыя часопісы таксама бываюць вартыя чытаньня.

**Сяргей Гезгала**

МЕНСКАЯ ПРЭМ'ЕРА

## Практыкаваньне ў рэтра

Пачатак 60-х, «другая хваля фэмінізму»… Маладая пісьменьніца Барбара Новак прыяжджае з правінцыі ў Нью-Ёрк, каб выдаць кніжку «К чорту каханьне!» — дапаможнік для кабет, якія жадаюць зрабіцца незалежнымі ад мужчынаў ва ўсіх сфэрах жыцьця. Кніга набывае шалёны посьпех (яе ўпотайкі набываюць нават у камуністычным Кітаі і СССР), а міс Новак узносіцца на вяршыні славы. Тады вядомы журналіст і «прафэсійны плэйбой» Кетчэр Блок ставіць сабе за мэту выкрыць ганарлівую фэміністку і давесьці ўсім, што яна — звычайная жанчына, якой таксама патрэбна каханьне…

Прыемна глядзець фільмы ёмістыя, шматслаёвыя, якія сумяшчаюць адзнакі некалькіх жанраў. Якраз такая стужка «К чорту каханьне!», завязка якой пададзена вышэй: гэта і рамантычная камэдыя, і пародыя на яе, і дасканалае практыкаваньне ў стылізацыі «пад шасьцідзясятыя». Фільм напоўнены шматлікімі «знакамі» тае эпохі: першыя касманаўты, Карыбскі крызыс, новыя павевы ў модзе, пачатак «бітламаніі». У пляне жартаў стужка робіць упор на дыялёгі — дасьціпныя, багатыя на гульню словаў. Выдатна глядзяцца ў сваіх ролях галоўных герояў і акторы — Рэнэ Зэльвэгер і Эван Макгрэгар. Можа, таму, што абое ўжо напрактыкаваныя здымацца ў рэтра-фільмах, — у першай было «Чыкага», у другога — «Мулен Руж».

**Іван Пятроў**



Працяг са старонкі 11.

# Сакрэт Бэндэ

Аглабельшчыкаў было шмат, але Бэндэ атрымаўся цэнтральнай сярод іх фігурай. Што праўда, ён сваімі артыкуламі ня вымасьціў сабе дарогі да высокіх пасадаў ды званьняў ці нейкага іншага скарбу. Да канца жыцьця застаўся правінцыйным выкладчыкам, якому нават у Беларусь вярнуцца не далі. В.Скалабан пэўны, што роля Бэндэ як галоўнага крытыка-аглабельшчыка ў Беларусі перабольшаная: «Ёсьць публікацыі Расьціслава Платонава, які на падставе партыйнага архіву расьпісаў увесь гэты мэханізм. І там Бэндэ недзе зусім-зусім унізе, бо ўсе гэтыя ацэнкі фармаваліся наверсе і, можа, ня столькі ў Менску, колькі ў Маскве».

Нарэшце, самае казытлівае пытаньне. Рэч у тым, што ў сваіх аглабельных артыкулах літаратурны кат Лукаш Бэндэ пісаў... праўду. Купала не разумее рэвалюцыі, Колас фармаваўся на ідэалёгіі заможнага сялянства, Бядуля — прадстаўнік дробнай буржуазіі... Калі выйсьці за рамкі бальшавіцкага эмацыйнага напаўненьня гэтых ацэнак, а прачытваць толькі іхны сэнс, пачынаеш разумець, што ўсё гэта праўда. І тое, што большасьць беларускіх літаратараў былі нацдэмамі — нацыянальнымі дэмакратамі, — таксама праўда. І што падкрэсьліваньне іхнай пралетарскай сутнасьці або адданасьці ідэям бальшавізму было найчасьцей крывадушным. Можа быць, тут і паўстае галоўная праблема таго часу? Бэндэ пісаў праўду, якая гучала як данос. Праўдзівы крытык быў стукачом.

Нашаніўскі нацыянал-лібэралізм, дробнабуржуазны нацыяналізм, ідэалізм... Цяпер мы разумеем, што клясыкі беларускае літаратуры сапраўды былі носьбітамі ўсяго гэтага, а значыць, у прымітыўнага пралетарскага рэвалюцыянізму былі ўсе падставы бачыць у іх ворагаў. Пры гэтым відавочна, што ў шэрагах пралетарскіх крытыкаў маглі быць абсалютна шчырыя, пераканаНыя ў вяршэнстве свае праўды людзі, якія сапраўды давалі рашучы адпор гэтым падкопам буржуазнага нацыяналізму ў імя той новай рэчаіснасьці, якая ствалася на іхных вачох у працэсе бязьлітаснай клясавай барацьбы.

У нас няма падставаў папракаць Бэндэ прынамсі крывадушнасьцю альбо няшчырасьцю. На гэтыя хвароБы хварэлі якраз тыя, пра каго ён пісаў, — пісьменьнікі, што хавалі сваю сутнасьць.

Ну не даводзіць жа нам сёньня, што Купала ня быў ідэолягам нацыянальнага адраджэньня! Наадварот, мы інакш пра Купалу і ня пішам. Выходзіць, Бэндэ меў рацыю. Але ў выніку гэтае рацыі гінулі людзі. Іх губіла сыстэма, для якой тая рацыя была даносам, а нацдэмы — ворагамі.

Сёньня мы пішам, што нацдэмы — гэта добра і карысна, але існуем у сыстэме, якая па-ранейшаму ставіцца да нацыянальнага адраджэньня варожа. Мы ня мелі суду над камунізмам, у выніку адбылася дзіўная дыфузія і блытаніна. Нацдэм Купала так ці інакш прызнаны за афіцыйнага клясыка, а нацдэм Быкаў для афіцыёзу нават пасьля сьмерці — ізгой. У поўнай адпаведнасьці з традыцыямі Бэндэ. Новы падручнік гісторыі для ВНУ ствараецца ў поўнай адпаведнасьці з традыцыямі аглабельшчыка ад гісторыі Абэцэдарскага. КДБ сьвяткуе свае «слаўныя» юбілеі ў поўнай адпаведнасьці з традыцыямі Цанавы. І ўсё гэта адбываецца ў незалежнай Рэспубліцы Беларусі, улады якой абвесьцілі пра стварэньне дзяржаўнае ідэалёгіі, дзе дамінуюць традыцыі сталінскага СССР. Гэтая мафія хоча быць арганічным працягам той мафіі.

Іншы раз здаецца, што чорнае памяці 1937 год зусім не скончыўся. Час спыніў свой вэртыкальны бег, а ўсё, што зьмяняецца, зьмяняецца на гарызанталі таго самага 1937-га. З астранамічнага году ён ператварыўся для нас у эпоху, канца якой не відаць. Даўно няма ў жыцьці пэрсанальна Цанавы, Абэцэдарскага і Бэндэ, але пэрсанажы іхныя жывыя і здаровыя.

Паэт Генадзь Бураўкін знайшоў такога сучаснага пэрсанажа рыхтык Бэндэ. У сваім выступе ў «БДГ» ён кажа: «У нашай гісторыі быў Лукаш Бэндэ, які прынёс страшэнныя страты беларускай літаратуры, сваімі пагромнымі артыкуламі скараціў гады і Янкі Купалы, і Якуба Коласа. Я думаю, што ня менш шкоды нашай культуры ўжо прынёс Уладзімер Пятровіч Заматалін. І як імя Быкава будзе ў гісторыі Беларусі стаяць ля імя Купалы, так і імя Заматаліна павінна стаяць каля імя Бэндэ».

Блытаніну, у якой мы сёньня апынуліся і жывём, вольна ці міжвольна множыла сама інтэлігенцыя, якая імкнулася апраўдаць і рэабілітаваць забітых, высланых і абылганых калег. Яны пісалі, што абвінавачаньні былі няпраўдай і што насамрэч Купала рэвалюцыю прыняў ды зразумеў, а Колас зь Бядулем былі зусім пралетарскімі творцамі. Усё гэтае пісаньне расквечвалася салютамі «вялікаму кастрычніку» і ленінскай праўдзе, якая бярэ верх над хлусьнёй вульгарызатараў. Усё канчаткова заблытвалася дзеля таго, каб толькі выцягнуць на паверхню забароненыя імёны і творы ворагаў народу.

Кажуць, што менавіта Бэндэ давёў Янку Купалу да самагубства. Гэты сюжэт апісаны ў рамане Алега Лойкі. У адрозьненьне ад Бэндэ, Купала апынуўся не ў сваёй сыстэме, як і большасьць беларускіх літаратараў. Што ім заставалася рабіць? Мабыць, нічога, калі выбранае было самагубства. Зьмяніць сыстэму яны не маглі, уцякаць не было куды і не было як, зьмяніць сваю нацдэмаўскую сутнасьць яны не маглі таксама. Яны сталі кожны сам насупраць сыстэмы, часткай якой быў Бэндэ.

Праблема суду над камунізмам зусім не ў камунізьме, а ў тым, што мусіць быць сьцьверджана іншая праўда. Мы можам колькі заўгодна крытыкаваць і тое, што было, і тое, што ёсьць, але так нічога і не зразумеем, пакуль не пачнём сьцьвярджаць, пакуль ня сьцьвердзім адваротнага.

Да прыкладу, як можна крытыкаваць антыбеларускую палітыку цяперашніх уладаў, выдаючы пры тым апазыцыйную газэту па-расейску? Як можна казаць пра рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі і пры гэтым друкаваць кнігі Ластоўскага і Геніюш тым рэпрэсаваным у 1933-м правапісам? Нябожчыкі варочаюцца ў трунах. Гэта ж тое самае, што зь імем вялікага кастрычніка на вуснах асуджаць Лукаша Бэндэ. Але гэта ня ваш, а ягоны Вялікі Кастрычнік. І вялікі Ленін — ягоны. І сьветлыя ідэалы камунізму — ягоныя. Бэндэ не крывадушны. Ён сапраўдны змагар сваёй сыстэмы. І калі ў нашых вачох ён — кат, значыць, мы — людзі іншай сыстэмы і іншай праўды. І пакуль мы не пачнём сваю праўду сьцьвярджаць, мы так і застанёмся крывадушнымі прыкрываламі-нацдэмамі — што за Сталіным, што за Хрушчовым, што цяпер.

Застанецца з намі і Бэндэ, дзіўнае прозьвішча якога мае як мінімум два пераклады. Па-латыску гэта кат, а па-польску — буду.

# Вяскоўкі хварэюць на рак грудзей радзей за гараджанак

## Анколяг Леанід Путырскі: «Любоў і ўвага блізкіх дапамагае чалавеку пазбыцца хваробы»


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«НН»: Амаль чвэрць стагодзьдзя Вы змагаецеся з ракам. Як Вы ўяўляеце яго?**

**Л.П.:** Некаторыя ўяўляюць яго жывой істотай, якая жыве ў чалавеку і не падпарадкоўваецца законам цела. Але насамрэч гэта клетка, якая праз мутацыю сталася не такой, як астатнія. Ні гармоны, ні мозг не кіруюць паламанай клеткай. Яна множыцца, утварае «горад у горадзе». І зьнішчыць гэты варожы лягер можна толькі апэрацыяй, апраменьваньнем, хіміятэрапіяй.

**«НН»: Кажуць, рак грудзей — хвароба некаханых жанчын?**

**Л.П.:** Ня цалкам, але ад гэтага залежыць шмат. Рак малочнай залозы прызнаны нэрвовазалежнай пухлінай. Абстаноўка на працы таксама важная. У нас часта бываюць пэдагогі, іншыя працаўнікі інтэлектуальных, гарадзкіх прафэсіяў. А вяскоўкі бываюць значна радзей.

**«НН»: А раптам вяскоўкі проста ня едуць у лякарню, а цягнуць да апошняга?**

**Л.П.:** Усё роўна мы даведваемся пра прычыны сьмерці. Статыстыка кажа: калі ў Менску 61 жанчына з кожных 100 тыс. летась захварэла на рак грудзей, то ў вёсках захварэлі 35—40 жанчын на 100 тыс.

**«НН»: Я чула, што рак грудзей — хвароба эмансыпаваных кабет.**

**Л.П.:** Жанчыны, якія мала й позна нараджаюць, кароткі час кормяць грудзьмі, бо любяць сваю кар'еру, лятуць на працу адразу пасьля родаў, — сапраўды нашыя кліенткі. Кар'ера кар'ерай, але калі жанчына хоча пражыць доўгае, якаснае жыцьцё, яна мусіць усё сумясьціць — мужа, дзяцей і кар'еру. У ЗША, дзе сярод жанчын пераважаюць «прафэсіяналкі», у 2—2,5 разу большая прапорцыя хворых на рак грудзей, чым у Беларусі. У нас летась захварэла 3021 жанчына, а ў Амэрыцы — 250 тысяч. Прыроды не падманеш. Манашкі ў 5—6 разоў часьцей хварэюць на рак грудзей, чым замужнія жанчыны й жанчыны, што нараджалі. Жанчына нарадзілася, каб самой нараджаць. Жанчыне трэба старацца сумяшчаць сям'ю й кар'еру, і пры тым не быць у пастаянным стрэсе.

**«НН»: Ня жыць у стрэсе? А як? 65% беларусак большую частку году бавяць у дрэнным настроі. Рак — хвароба бедных і гаротных.**

**Л.П.:** Я з Вамі згодны. Але ня бедных, а менавіта тых, хто гаруе. Перажывае ўціск, прыніжэньне, прымус, не спрабуе змагацца са стрэсам.

**«НН»: Мужы кідаюць жанчын, якія захварэлі?**

**Л.П.:** Колькі сем'яў — гэтулькі й выпадкаў. Тыя, хто застаюцца з жонкамі, — сапраўдныя мужчыны. Калі жанчына вяртаецца з анкадыспансэру ў шчасьлівую сям'ю, яна будзе здаровая. А калі яе жыцьцё з мужчынам ня ладзіцца, адбываецца вяртаньне хваробы.

**«НН»: Што яшчэ трэба рабіць, каб менш пагражала хвароба?**

**Л.П.:** Вядзіце здаровы лад жыцьця, піце вітаміны, рэгулярна адведвайце гінэколяга й анколяга.

**«НН»: Многія жанчыны, нават калі знойдуць прыкметы хваробы, баяцца ісьці да лекара. Маўляў, я лепш памру ўся, чым буду выжываць па частках.**

**Л.П.:** Гэта празь неадукаванасьць і дзікунства. Нават калі ў той жанчыны ня рак, а мастапатыя, яна ўжо памірае па частках кожны дзень — ад страху. Страх — найлепшы асяродак для хваробы.

**«НН»: Кожная другая-трэцяя жанчына ў краіне хварэе на дабраякасныя наватворы, у тым ліку мастапатыяй. Ці часта яны ператвараюцца ў злаякасныя?**

**Л.П.:** Мастапатыя — ня рак і не передракавая хвароба. Але яна сьведчыць пра шкодное ўзьдзеяньне на арганізм. Трэба паказвацца анколягу раз на паўгоду. Такія жанчыны падлечваюцца мэдыкамэнтозна, фізіятэрапэўтычна.

**«НН»: Кажуць, што гіпадынамія ўплывае на захворваньне.**

**Л.П.:** Так. І ня толькі яна. Важна зьмяняць звычкі, спрабаваць новае, ня жыць так, як маці-бабкі альбо бацькі-дзяды. Ёсьць спадчынны рак, а ёсьць сямейны. Спадчынны перадаецца генэтычна. Сямейны ж узьнікае і ў бабкі, і ў маткі, і ў дачкі таму, што яны жывуць у аднолькавых умовах, у іх аднолькавыя стрэсы, харчаваньне, апраменьваньне ад сьценаў, аднолькавая экалёгія.

**«НН»: Кажуць, «паламаныя» гены навучыліся рамантаваць?**

**Л.П.:** Пакуль толькі выяўляць. І беларуская анкалёгія тут на добрым прафэсійным узроўні. А над тым, каб рамантаваць, анколягі толькі працуюць.

**«НН»: Ці ёсьць у нашай краіне псыхаанкалёгія?**

**Л.П.:** Раней не было. Толькі два гады таму ў Інстытуце анкалёгіі пачаў працаваць псыхоляг. Ён, а не хірург, — першы, да каго кіруецца жанчына. Бо напалоханая, забітая адчаем жанчына змагаецца не на баку хірурга супраць раку, а на баку раку супраць хірурга. Мы першыя ў Беларусі ўтварылі арганізацыю, якую назвалі «Ў промнях надзеі», — для жанчын, што перанесьлі мастэктамію. За мяжою такіх арганізацыяў шмат, а ў нас няма. І жанчына застаецца сам-насам са сваёй бядой. Няма каму ёй паведаміць, што рак — не сьмяротнае захворваньне. Цяпер у краіне 25 тыс. жанчын, што вылечылі рак грудзей. За мяжой для іх ёсьць кнігі, асяродкі, там абвяргаецца распаўсюджаная думка, што сэксуальнасьць кабеты, ейная каштоўнасьць жорстка залежаць ад наяўнасьці ў яе поўнага камплекту грудзей. Мы гэта толькі распачынаем.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**



ДАВЕДКА «НН»

Леанід Путырскі нарадзіўся ў 1956. Да 17 гадоў жыў у Маладэчне. Мэдыкам вырашыў стаць пасьля таго, як у дзяцінстве ледзьве не загінуў, завалены пяском у водаправоднай траншэі, а дактары яго выцягнулі з таго сьвету. Вынаходнік некалькіх прыладаў і мэханізмаў, што паляпшаюць якасьць апэраваньня. Праўдзейны чалец некалькіх Акадэміяў навук.

Аўтар пяці зборнікаў вершаў. Часам прысьвячае вершы сваім пацыенткам: «Гэта лекі. Калі прысьвячаеш шчыры, пяшчотны верш жанчыне пасьля мастэктаміі, яна аджывае».

# Хімэры сярод нас

**Хімэры — гэта ня толькі міталягічныя істоты. Сапраўднымі хімэрамі зьяўляюцца некаторыя людзі. А ў пэўным, вузкім сэнсе да іх можна аднесьці кожнага.**

«Ты цалкам упэўненая, што гэтае дзіця тваё?» — пытаецца занепакоены бацька ў сваёй дачкі-падлетка на позьняй стадыі цяжарнасьці. Гэты жарт набывае новае адценьне цяпер, калі дактары апісалі неймаверную гісторыю. 52-гадовая амэрыканка Джэйн чакала апэрацыі па перасадцы нырак. Аналізы крыві яе найбліжэйшых сваякоў, якія павінны былі вызначыць найлепшага донара, прынесьлі неспадзяванку: двое з трох сыноў Джэйн не былі яе дзецьмі, хоць бацькам усіх трох быў яе муж. Нейкім цудам ёй удалося нарадзіць чужых дзяцей.

Два гады дактары біліся над вырашэньнем гэтай загадкі. Урэшце ўсё склалася ў лягічную, хоць і сэнсацыйную, карціну: Джэйн была хімэрай, якая ўзьнікла ў выніку зьліцьця ва ўлоньні маці двух'яйцавых сясьцёр-блізьнятаў. Некаторыя часткі цела Джэйн паходзілі ад яе сястры, іншыя былі яе ўласнымі.

Далейшыя дасьледаваньні выявілі рэч, якой ніхто не чакаў: выпадак Джэйн не зьяўляецца ўнікальным капрызам прыроды, а хімэры — літаральна — жывуць паміж нас.

### Мой брат — ня мой брат

Але ж сыны Джэйн, якой бы ні была прырода іх маці, мусілі мець яе гены. А з аналізаў вынікала, што ня мелі. Хімэролягі — калі можна казаць пра такую спэцыяльнасьць — яшчэ раней ведалі, што ў асобін, якія зьявіліся на сьвет ад двух бацькоў, разьмеркаваньне клетак з абедзьвюх «крыніц» не абавязкова павінна быць раўнамерным: у некаторых тканках могуць пераважаць клеткі ад аднаго бацькі, у іншых — ад другога. Калі дасьледавалі храмасомны набор Джэйн з клетак шчытападобнай залозы, эпітэлю вуснаў і валасяных цыбулек, выявілася, што некаторыя зь іх утрымліваюць набор 1 і 3, а іншыя — 2 і 4. Гэта пацьвердзіла: Джэйн была «падвойнай».

«Падвойнымі» былі і ейныя яечнікі, таму частка яйцаклетак, што яны выпрацоўвалі, мела храмасомны набор 1 ці 3, частка — 2 ці 4. Значыцца, сыны Джэйн былі ня роднымі братамі адзін аднаму, а стрыечнымі!

### Хімэры множацца

Наколькі выключны выпадак Джэйн? Цяжка сказаць, бо такія дасьледаваньні праводзяцца рэдка. Здараецца, што падвойнае паходжаньне чалавека знаходзіць адлюстраваньне ў яго́ных фізічных рысах. Так было ў выпадку адной дзяўчынкі, якая мела вочы розных колераў. Дасьледаваньні пацьвердзілі яе «хімэрычную» прыроду.

Некаторыя выпадкі гермафрадытызму таксама могуць вынікаць з хімэрызму — зьліцьця блізьнятаў розных полаў. Беручы пад увагу тое, што сучасныя мэтады лячэньня няплоднасьці прыводзяць да павелічэньня колькасьці шматдзетных цяжарнасьцяў, а сродкі, якія стымулююць авуляцыю, нярэдка правакуюць выхад больш чым адной яйцаклеткі, можна чакаць, што частата такіх выпадкаў значна ўзрасьце.

**Паводле «The New Scientist»**

# Прафэсійныя хваробы музыкаў

**У той момант, калі музыка выціскае апошняе з свайго кларнэту, рэжа на скрыпцы што ёсьць моцы ці перабірае з вар'яцкай хуткасьцю клявішы, публіка ад душы радуецца, а вось самі музыкі пакутуюць.** Прафэсар Гельмут Мюлер зь Нямецкага таварыства музычнай псыхалёгіі й мэдыцыны лічыць, што аркестравая яма — самае небясьпечнае працоўнае месца ва ўсёй Нямеччыне. Тры чвэрці ўсіх музыкаў маюць «прафэсійныя» праблемы са здароўем: пагаршэньне слыху, выкліканае гучным граньнем аркестру; аднабаковае напружаньне цягліцаў, сухажыльляў і суставаў, што выклікае пастаянны боль ва ўсім целе. Так, у скрыпачоў баліць падбародзьдзе, альтысты скардзяцца на плечы, а піяністы пакутуюць на сутаргі ў пальцах. Таму вельмі важна, лічыць Мюлер, каб музыкі, як і спартоўцы, «разаграваліся» перад выступам і сачылі за паставай. Гэта тычыцца таксама і дзяцей, якія толькі пачынаюць вучыцца граць на музычных інструмэнтах.

**«Bild der Wissenschaft»**

## Варшаўскі заапарк



Warsaw Zoo. Apple Tea (p), Apple Tea, 2003

Доўгачаканы альбом вядучага калектыву сучаснага джазу нарэшце ўбачыў сьвет. Задуманы ён быў яшчэ ў 2000-м. Летам таго ж году альбом нават быў запісаны, аднак пазьней музыканты атрымалі кантракт на работу ў Польшчы, дзе між іншага выступілі ў праграме слаўтага фэстывалю «Jazz Jamboree» і гралі на прыёме з нагоды візыту вядомага амэрыканскага саксафаніста Біла Клінтана. Работа над альбомам спынілася, і толькі ў 2003 г., поўныя польскіх уражаньняў, музыкі вырашылі зьдзейсьніць подзьвіг, роўных якому ў беларускай музыцы не было: маючы ўжо запісаны альбом, яны зноў пайшлі ў студыю, каб усё перазапісаць па-новаму. Во даюць!

Не без уплыву саўнд-прадусара Андрэя Жукава было вырашана надаць альбому фанкавы характар. І ў выніку атрымалася інтэлігентная і густоўная работа, цікавая ня толькі фанатыкам фанку, але й тым, хто шануе памайстэрску напісаную і ўвасобленую разумную музыку. А то!

Распачынае альбом п'еса «Жывец», якая можа зрабіцца візытоўкай вядомага гатунку піва. Альбом складаецца зьболышага даўно вядомыя тэмы Ігара Сацэвіча, лідэра гурту, увасобленыя згодна з абранай канцэпцыяй. Толькі фанкі польскай тэматыкі ды «Гутарка з сэрцам» — новыя кампазыцыі. Найбольш знаная тэма бэнду «Яблычная гарбата» зноў (у каторы гэта ўжо раз?) была запісаная з дапамогай першага саксафаніста групы Андрэя Матліна, што цяпер жыве ў Злучаных Яблычных Штатах. Запісаў ён сваю партыю на сапране з дапамогай Інтэрнэту. Такім самым чынам Матлін саліруе ў загалоўнай п'есе «Варшаўскі заапарк» і ў фанкавай вэрсіі ўсё той жа «Гарбаты». Супастаўленьне дзьвюх вэрсій адной п'есы — добры дапаможнік для тых, хто слаба пакуль арыентуецца, што гэта за штука — мастацтва аранжаваньня (для ўдзельнікаў будучых трыб'ютаў). Вось так!

«Варшаўскі заапарк» мусіць зрабіцца адным з гітоў групы нароўні зь «Яблычнай гарбатай» ці «Пчаліным танцам». Твор не для гіт-парадаў, а для тых, хто шануе ў музыцы найперш мастацтва кампазыцыі, аранжаваньня, мэлядызм і проста прыгажосьць. Годзе таго!

Дызайн альбому, канцэптуальны і тонкі, выкананы суполкай Цэсьлер—Войчанка, безь якіх сёньня ўявіць гісторыю беларускай папулярнай музыкі робіцца ўсё складаней. Паспрабуйце згадаць хоць адзін правальны альбом, які б яны афармлялі. Во як!

Мінулы свой дыск людзі Сацэвіча выдалі з тэкстамі на вокладцы — па-ангельску і на тарашкевіцы. На адваротным баку «Варшаўскага Зоо» лацінкай напісана «Zroblena u Belarusi». Гэта, мусіць, для тых, хто ня ведае нашых і ня верыць, што такую якасную музыку могуць выпускаць ня толькі ў якім Парыжы ці Варшаве, але й у Менску. Ведай нашых!

**Яблычны Слухач**

## Сонца разьліваецца




Солнце разливается. По глазам (р), Real Records, 2003

Больш дакладна было б казаць пра дэбютны альбом расейскамоўнай сьпявачкі, аўтаркі музыкі й вершаў Станіславы «Стасі» Зылікавай. Яна пару гадоў таму засьвяцілася ў менскіх клюбах як лідэр-асоба гурту з афтальмалягічнай назвай «По глазам». Альбом складаецца з матэрыялу ажно трох розных сэсій запісу, зробленых практычна з трыма рознымі калектывамі.

Песьні хоць і на аматара, але не выпадковага. Не папса, але й ня рок. Нешта вельмі асабістае, пазафарматнае. Не радыйна-эфэмістае, але й і не глыбока закапаны андэрграўнд. Асобасная музыка, самабытная паэтыка, якая, пры ўсёй яе экспэрымэнтальнасьці, знаходзіць сабе сяброўку ў асобе не абы-якой мэлёдыкі. Перш-нае, што просіцца пры спробе параўнаць (а мы гэта вой як любім, адно каб не называць новае сапраўды новым!), — Земфіра, толькі што больш эстэцкая, эўрапеізаваная і, прабачце, добра вымытая. А тое, што тварам Стася дасьць Земфіры 100 балаў наперад, — без варыянтаў!

Калі яна й надалей будзе трымацца гэткага ж напрамку, трывожна лявіруючы паміж камэрцыяй і тым, што ёй хочацца рабіць, наўрад ці дасягне трывалага становішча ня тое што ў Беларусі, але й у Расеі.

У слухачоў гэтага альбому вочы на лоб не павылазяць, але і па дапамогу да лекараў зьвяртацца ня будзе патрэбы. Хоць бы таму, што нічога блізкага да зробленага Стасяй у нас не было.

**Слухач Разьліваны**

## Гарадзкія



Garadzkija (p), 2003

Аднойчы Pete Paff вырашыў, што пара выходзіць за межы ролі другога пляну ў цені «галавы праекту». Аднак вышэй галавы ня скочыш: нават манера выкананьня ў многіх трэках нагадвае Вольскага. Невядома, чаго чакалі ад альбому стваральнікі і ўкладальнікі, але нечага лепшага за «NRM» ня выйшла. Ёсьць песьні, якія захапляюць стылёвасьцю музычнага вырашэньня, настраёвай складзенасьцю («Як манэкен», «Сіні апэльсын», «На далоні»). Ёсьць энэргічныя трэкі, якія трэба слухаць, калі «сядае батарэя»: «Каўбасіць ды плюшчыць» — пра жыцьцё менскіх арак і пад'ездаў. «Мяне нясе» — для самай нэрвовай стадыі захаханасьці. «На край» — калі трэба тэрмінова кульнуцца з краю ложку і ісьці на працу. Гэта добрыя пазытыўныя моманты, праз якія CD варта набыць. Усё ня так і кепска, музыка якасная і канкурэнтаздольная.

**Teda Lee**

## Наша музыка-1



Зборка, Arlo records. 2003.

Беларускія прадусары нячаста выпускаюць складанкі. «Наша музыка-1» — чарговы выняток з правіла. Прадукт выйшаў досыць стракатым, але ў прынцыпе слухабэльным. На кружэльцы 14 «яўных» і колькі «схаваных» трэкаў. Чатырнаццатка склалася паводле меркаваньняў слухачоў, што паўгоду замаўлялі беларускае на адной зь менскіх радыёстанцыяў. Самыя гітовыя кампазыцыі зборкі — «Лёгкія лёгкія» (маркесаўскі Палкоўнік на міцкевічаўскіх Дзядах ад «NRM»), «Глядзі» (постіндустрыяльная акулістыка ад «J_Mors») і «Не трывай мяне» (высьвятленьне сноў ад бярозаўскага гурту «BN»). Не званітуе і ад ладнай часткі расейскамоўных песьняў, напрыклад: «Новый год» (земфіроідная інструкцыя постаббаўскага happy new year'а ад гурту «Лангальеры»), «Между Минском и Римом» (новая «Кроніка Быхаўца» паводле «Стокс»), «Давай покурим» (антыцікатынавая жуйка ад «Каравану»). Прадусарам — падзяка і зычэньне канцэптуальнасьці на наступным CD.

## Танцавальны




Танцевальный. Тяни-Толкай, (C) & (P) West Records. 2003.

Да творчасьці гурту «Цягні-Штурхай» (а так у беларускую перакладаюць назву самі музыкі) можна ставіцца па-рознаму. Іх стыль — гэткі сьцёбавы ракапоп з магчымымі нахіламі ў розныя бакі — для постсавецкае прасторы неарыгінальны. Ён эксплюатуецца і «Ляпісам Трубяцкім», і Веркай Сярдзючкай, і халернаю купай расейскіх гуртоў («Жуки», «Дискотека Авария» ды інш.). Ва ўмовах яшчэ добра адчувальнай прывязкі Беларусі да расейскай інфармацыйна-культурнай прасторы цяжка заслужыць увагу слухача і статус собскае адметнасьці. «Крамбамбулі», напрыклад, гэта ўдаецца дзеля нязвыклай у папсовай традыцыі белмоўнасьці. «Цягні-Штурхай» сьпявае пераважна па-расейску і часьцяком апелюе да агульнасавецкіх культурных сымбаляў. Аднак, слухаючы «Танцавальны», складана памыліцца і палічыць гурт расейскім. Беларускае паходжаньне выдаюць асаблівасьці гуку, аранжаваньня, у пэўнай ступені слэнгу і алюзіяў («Сёньня ў нашай хаце heavy metal party!»). Героі ж песень нібы перавандравалі з Глёбусавага «Дамавікамэрону»: мадэлі ў чужой пасьцелі, аголеныя ў роснай траве, дзевачкі-маньячкі з заточкамі, цнатлівазьнішчальнік, рэпэтытарка, што любіць маляваць на целе... «Танцавальны» здольны расшавольваць і КХП, і КДБ.

**Сяргей Балахонаў**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Вечар з «Крамай»

**12 сьнежня ў клюбе «Акварыюм» (вул. Кульман, 14) дае сольны канцэрт гурт «Крама».** Варашкевіч мае сьпець колькі старых гітоў. Прапускаць такую падзею ня варта: «Крама» выступае ня часта. Перад легендамі айчыннага року зайграе група «Consul band» (блюз-рок). Працуе бар зь півам. Пачатак а 19-й. Цана квітка 7000 руб.

### «Ляпісы» вяртаюцца



АЛЕНА АНДРЭЕВА

**13 сьнежня ўначы ў клюбе «Бліндаж» (вул.Ціміразева, 9) будзе граць «Ляпіс Трубяцкі»** — група, якая не давала канцэртаў у менскіх клюбах ажно два гады. Каманда прэзэнтуе праграму «Будзе ўдача», у якую ўвойдуць як песьні з апошняга сынглу — «Чырвоныя кальсоны», так і зусім новыя. Група стала пазіраць у бок рэгі й ска, тэксты пасур'ёзьнелі, але фірмовы «ляпісаўскі» гумар застаўся. Міхалок, у сваю чаргу, падвучыў беларускую мову. На «пасталелых» «Ляпісаў» можна паглядзець за 18 тыс. руб. Пачатак у 23.00.

### Дубальтовая прэзэнтацыя

**16 сьнежня а 18.30 у памяшканьні Беларускага ПЭН-цэнтру адбудзецца прэзэнтацыя кнігаў Юр'я Гуменюка «Вуліца Тыгровых Архідэяў» ды «Брат Зло» Густава Герлінга-Грудзіньскага ў перакладзе Сьвятланы Курс.** Удзел бяруць Кася Камоцкая ды Віктар Корзун. Запрашаем усіх аматараў да добрай літаратуры і кроплі віна. Кнігу можна замовіць праз электронны адрас bielbook@tut.by.

### Пад гукі дудуку

**17 сьнежня ў клюбе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) зайграе «Харлі».** Пасьля сёлетняй перамогі на «Залатым шлягеры» ў намінацыі «ВІА імя Ўладзімера Мулявіна» гурт набыў прыдомак — цяпер музыкі называюцца «ВІА «Харлі». Каманда мае прэзэнтаваць шоў-праграму «Родныя мясцовыя». Дапамагаць ёй будзе запрошаны з Масквы Карэн Арацюнян, майстар ігры на дудуку — армянскім народным інструмэнце. Пачатак а 19-й.

### Выстава Цыркунова

**Да 27 сьнежня ў сядзібе Партыі БНФ (Менск, вул.Варвашэні, 8) экспануецца выстава твораў Алеся Цыркунова, прысьвечаная 83-й гадавіне Слуцкага збройнага чыну.** Сярод 29 палотнаў — партрэты Міколы Ткачова, Зоські Верас, Лявона Луцкевіча й іншых слаўтых дзяцей Беларусі, архітэктурныя помнікі, пэйзажы, міталягічныя сюжэты. Апрача таго, на выставе ёсьць партрэт кіраўніка Слуцкага паўстаньня Ўладзімера Пракулевіча пэндзля Ўладзімера Сулкоўскага.

**СБ, ВД**

# Дабрачынны канцэрт Кулінковіча

**21 сьнежня «Нэйра Дзюбель» зь сябрамі ладзіць дабрачынную акцыю. Сродкі пойдуць на падарункі дзецям зь бедных сем'яў.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Клюб «NC» (вул.Кастрычніцкая, 17) задарма дае пляцоўку. Прафсаюз супрацоўнікаў «Камунаркі» — цукеркі па сабекошце. «Белпошта» дапаможа з адрасамі дзяцей, якія пісалі лісты Дзеду Марозу й прасілі даслаць хоць бы шакаладку.

«Ніякіх рахункаў заводзіць ня будзем. Атрымаем прыбытак з канцэрту — адразу ж адашлём па адпаведных адрасах, а мо нават і прывязём самі. Галоўнае — да Новага году ўправіцца, — гаворыць Аляксандар. — Калі мая ініцыятыва выкліча хоць некалькі дзіцячых усьмешак, палічу, што буду з чыстым сумленьнем».

Удзел у акцыі возьме, акром «Нэйра Дзюбелю», Аляксандар Памідораў — у яго якраз 21-га дзень народзінаў, а таксама «ZET» і некалькі маладых гуртоў. Цэны на квіткі будуць зманлыя, як для нагоды: 8—10 тыс. руб.

**Сяргей Будкін**

# З запазухі

Рыгор Барадулін

**Працяг. Пачатак у «НН» № 19, 21, 23, 26, 29, 31, 33.**

## Ня тры, а трыццаць тры!..

Алесь Асіпенка быў пісьменьнікам з партызанска-камсамольскага прызыву. Рэдагаваў і газэту «Чырвоная змена», і часопіс «Маладосць». Свой партызанскі й камсамолакіраўнічы досьвед скарыстоўваў у творах сумленна, наколькі гэта льга было ў тагачасьсі. Дапытлівы, субяседлівы, уважліва ставіўся да нас, маладых, і мы хінуліся да яго, не на багата гадоў старэйшага ад нас. Усё, пра што цяжка было напісаць, стараўся распавесьці, як бы скінуць цяжар з душы. І партызаншчына глядзелася як чорна-белая кроніка, а не як нафарбаванае кіно.

Бярэзьнік. Возера. Малады партызан толькі вярнуўся з заданьня, яшчэ не зусім умеючы, голіцца. Прыляцела карэспандэнтка з «Комсомольской правды». Інтэрвіюе ляснога салдата.

— Колькі ты немцаў забіў?

— Тры.

Камісар, які стаіць неадступна тут жа, амаль крычыць:

— Ня тры, а трыццаць тры!

Герой нясьмела ўдакладняе:

— Усё-такі тры.

Камісар як не выскоквае зь сябе:

— Табе што, фрыцаў шкада? — і да карэспандэнткі: — Пішы пяцьдзясят.

Да слова прыйшлося. Хведар Бачыла, нязьменны фотакарэспандэнт «Чырвонай змены», былы партызанскі падрыўнік, распавядаў, як падрываліся цягнікі.

На баявое заданьне йдзе тройка падрыўнікоў. І на цягу чыгункі ад адной станцыі да другой — каля чатырох-пяці троек. Калі нейкая тройка падрывае адзін цягнік, кожны з гэтых троек запісвае сабе на ўзарваным цягніку. (Партызаны такім чынам зьнішчылі гэтулькі цягнікоў, колькі, відаць, і ў райху не было.)

Пасьля барацьбы з нацдэмаўшчынай у жахотных трыццатых гады ацалелыя беларусы баяліся называцца беларусамі (пасьля вайны ласкава дазволілі крамлёўскія мазгаўкладчыкі ціха называць сябе беларусамі тым, што засталіся жыць).

Зноў жа распавядаў зоркі на дэталі пісьменьнік. Саратаў. Алесь Харытонавіч пасьля цяжкога раненьня ледзьве адкляваўся ў тылавым шпіталі. Ідзе па горадзе. У чарзе нейкі мужчына просіць прадаць шкарпэткі. Узрадаваўся земляку партызан:

— Здарова, браток-беларус.

— Я не беларус, я — рускі, — аднекнуўся няўдалы пакупец.

— Дык ты ж просіш шкарпэткі.

— А як па-руску трэба сказаць? — сумеўся зямляк-вырачэнец.

І быў самы, бадай, вясёлы, да трагічнасьці, эпізод у Асіпенкі як камсамольскага кіраўніка.

Яшчэ ня скончылася вайна. Чысьціна Магілёўшчыны зноў пад чырвоным сьцягам. Ідзе кампанія збору сродкаў на пабудову самалёта. Сход у сельсавеце. Палкія прамовы, патрабавальныя заклікі. Ахвотнікаў здаваць грошы няма. І тут падымаецца яшчэ крамяны дзядок і называе суму ў некалькі тысячаў, якую ён аддае на пабудову самалёта. Перамога. Тут жа пасылаецца тэлеграма Сталіну, у якой называецца прозьвішча патрыёта й сума.

Райкамаўцы шчасьлівыя. Вызначыліся. А ў дадатак да ўсяго ў іх будуць наяўныя грошы, каб выдаць зарплату сабе, пакуль усталюецца банк. Бо райкам яшчэ паходны.

Чакаюць дзеда з торбай грошай. А яго як няма дык і няма. Пасылаюць аднаго райкамаўца, а дзед адразу ж халодзіць гарачую галаву салдата ідэалягічнага фронту:

— Адкуль гэта ў мяне такія грошы? Каб капейчына за душой.

Райкамавец, на якога адразу дыхнула сібірскай тайгой, пачынае даводзіць, што тэлеграма самому таварышу Сталіну пайшла, што вынікі могуць быць самыя сумныя. А дзед спакойна тлумачыць:

— Гэта ж я даваў пачын. У мяне да вайны сын быў старшынём сельсавету, і я добра ведаю, што пры савецкай уладзе пачын даражэйшы за грошы.

Да пачынадаўцы пасылаецца яшчэ адзін райкамавец. Той жа самы аргумэнт у дзеда. Праўда, гэтаму апэратыўніку ўдалося выявіць у хлеве парсюка-леташніка.

Да дзеда перабіраецца як ня ўвесь райкам. Ухапіліся, як тапелец за саломінку, за парсюка-кормніка. Угаворваюць закалоць і выручыць грошы. Бо наўкол — каб якая скароміна ў каго.

Райкамаўцы расстараліся і гарэлкі, і нейкай закусі з партыйных пайкоў. Туманяць — п'юць і паляць да сініга дыму суткамі. І пачынаецца торг.

— Дзед, вы з бабай гладка абнасіліся, дадзім сукна табе на пінжак і штаны, бабе на сачок і спадніцу.

Дзед бярэцца за нож і войстрыць яго аб загнет. А баба перавешваецца з-за коміну:

— Скульля табе, а не парсюка. Ня ты карміў, ня ты й калоць будзеш.

І доўжыцца торг. Дзеду й бабе абяцаюць па цёплым кажуху вайсковым, лесу на хату, бо дзедава крэпасьць ужо ў зямлю ўрастае.

І зноў дзедава вастрэньне нажа аб загнет, і зноў бабіна «скульля» з-за коміну.

Нарэшце нехта з кемлівейшых ідэолягаў ціхенька пайшоў у хлеў, уклаў парсюку ў вуха наган і пад шум трывожнага застольля скончыў з торгам.

У дзеда яшчэ знайшлося колькі мяхоў мукі. Быў райкамаўцам клопат давезьці на далёкі гарадзкі базар увесь гэты ходкі тавар па разводзьдзі ды па бездарожжы.

Выручаных грошай хапіла на дэкляраваную суму, яшчэ й дзеду засталося. Сукно, кажухі, лес дзед спраўна спагнаў з дабрадзеяў.

А неўзабаве прыйшла тэлеграма: «Дзякую калгасьніку Пынцікаву за грошы на пабудову самалёта. Сталін».

Дзед з тэлеграмай хадзіў недатыкальнай асобай. І торкаў начальнікам у нос:

— Бачыце, хто мяне ведае, а вы хто такія?

Казаў Асіпенка, што дакладная інфармацыя пра партызанскія подзьвігі, пра страты немцаў у жывой сіле і ў тых жа самых цягніках маецца толькі ў КГБ, а яна, у сваю чаргу, з трафэйных дакумэнтаў. Нямецкая звышдакладнасьць і ў вайну мела сілу. Да прыкладу, занатоўвалася, што партызанамі пашкоджана сто трынаццаць мэтраў і адзінаццаць сантымэтраў рэек, а Гансу Мюлеру адарвала палову мезенага пальца.

Шкада, што сам Алесь Харытонавіч не напісаў пра ўсё, што ведаў, што мулялася яму. Ці таму, што час не прыйшоў, ці таму, што сам пісьменьнік ня мог вырвацца з свайго часу, які трымаў яго.

Узгадваю апошнія сустрэчы. У выдавецтве выходзіць збор твораў Алеся Асіпенкі. Шчасьлівы аўтар нясе чарговы том. І ўсё-такі шкадуе: «Калі б сакратаром ЦК быў Аксёнаў, ён бы, як таварыш па рабоце ў камсамоле, даў бы мне не чатыры, а пяць тамоў...»

## Далучэньне

У сялянскім побыце не было такога панятку, як фіззарадка, фізкультура. Селянін, пакуль жыў, рухаўся, ды не абы-як — ён круціўся, як той скурат на агні.

І малога, як бы цяпер сказалі, трымалі ў спартыўнай форме. Усё йшло на гульні, на пацешных забавах.

Сам памятаю. Бацька, прыйшоўшы з работы, паказваў мне, як мужык саху вытрасае. Браў мяне за ногі й далікатна трос уніз галавой. Гэта была як бы вушацкая ёга.

— А як барсук сваіх дзяцей гладзіць, паказаць? — пытаўся бацька й паказваў.

Спачатку сваёй цьвярозай даланёй праводзіў ад падбародзьдзя да патыліцы, а пасьля назад. У асноўным увесь масаж прыпадаў на нос, які рабіўся то кірпатым, то гарбатым.

Пасьля вячэры з адплатнай ахвотай я мясіў клёцкі бацьку. Упіраўся ў жывот кулачкамі штомоцы.

Праз гульню йшло далучэньне да працы. Бяз нуднай дыдактыкі.

## Рост

Званю Васілю Быкаву ў Нямеччыну па клопаце ягонай новай кнігі. Віншую з Калядамі, перадаю паклоны й вітаньні ад усіх аж да ката Мірона. Васіль пад канец кароткай размовы:

— Чытаў у «Беларускай дзелавой», як вы з Караткевічам куплялі навагоднія ёлкі. А яшчэ чытаў, як ты ў інтэрвію раіш пахмяляцца, дасюль помніш. Ты ўжо друкуешся ў разьдзеле «Кулінарыя». Расьцеш!

## Пільныя рукі

Савецкая патрыятычная паэзія поўнілася патасам перабольшваньня цяж касьцяў самых невераемных. І ўзьнікалі вобразы сацрэалізмаўскіх Гераклаў, Антэяў, Адысэяў. Праўда, сіла ўявы, палёт фантазіі былі ў асноўным на гегемона-калгасным узроўні. Бадай адзін Аўгій меў паўнаважкі клопат у калгасных канюшнях ды кароўніках.

На лекцыях па антычнай літаратуры неяк засьвярбела мне напісаць нешта супэрсацрэалізмаўскае. І пайшлі радкі:

Сьцягі мы рвалі на анучы,
Анучы рвалі на сьцягі.
Ішлі церазь пясок сыпучы
У дзьве, ў чатыры, ў тры нагі.
Ваўкі лізалі нашы раны,
Раі варожых куль гулі.
У камсамолак неўзараны
Дзялянкі вабныя былі.

Аж на двух лістках газэтнай паперы, здабытай у «Чырвонай змене», нарыфмавалася ўра-лірыкі — шчасьлівы перадаў чытаць. Пайшла па руках. І да канца лекцыі зьнікла. Відаць, трапіла ў пільныя рукі.

## Дэгустатары

Вушацкія мужчыны былі неблагімі дэгустатарамі ня толькі самагонкі, беспамылкова адрозьніваючы катлянку ад паравой, пяршак ад адгону.

Не тэарэтыкі, а практыкі цьвердзілі: ласей за ўсё рыба з вады, мяса з-пад нажа, а маладзіца з лазьні.

У параўнаньні прыходзіў вывад: жонка другая — як учарашні булён. А яно й сьвежы булён — справа нетрывалая. І таму цешылі сябе сямейнікі несамавітай хітрасьцю: калі да сваёй жонкі праз акно залезьці, інакшы смак.

**Працяг будзе.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК



Саша і Сірожа бяз грыму

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## І Сірожу тожа

**Сашу і Сірожу** зьнялі з БТ. Іх праграма «Дастань зорку» пакуль ня будзе выходзіць. Афіцыйнае тлумачэньне — «аптымізацыя сеткі вяшчаньня» і нізкі рэйтынг. Зьняцьце з этэру падазрона супала із зьяўленьнем Міхалка і Хацкевіча на расейскім канале РТР у праграме, прысьвечанай беларускай ідэалёгіі.

## Правасудзьдзе праз 20 гадоў

**Барбара К.**, супрацоўніца польскіх спэцслужбаў за Ярузэльскім, якая зьдзекавалася на допытах з арыштаваных актывістаў «Салідарнасьці», атрымала два гады ўмоўна. У Польшчы йдзе каля 900 сьледстваў па справах камуністычных злачынцаў. Нагода задумацца беларускім судзьдзям ды праваахоўнікам.

## Кітайцы нас ня цэняць

**Вольга Неўдах**, «Міс Беларусі'2002», ня трапіла ў першую дваццатку на конкурсе прыгажуняў «Міс сьвету' 2003» у Кітаі. Перамаглі ж ірляндка, канадка і кітаянка. У Эўропе Вольга дайшла да паўфіналу.

## Разьмяняйце 200 даляраў

**Невядомы амэрыканскі фальшываманэтчык** вырабіў 200-даляравую купюру. На адным баку банкноты быў партрэт Буша-малодшага, на другім — Белы дом, перад фасадам якога стаялі таблічкі: «У ЗША трэба зьменшыць падаткі», «Мы любім марозіва» і інш.

## Самы дурны злодзей

**Рабаўнік, што залез у адзін з офісаў у нямецкім Брэмэне,** доўга выцягваў з кававага аўтамата жэтоны, якія ня дзейнічаюць па-за межамі будынку, прыхапіў бяздротавы тэлефон, які таксама далей ганку не працуе, і электрычную адкрутку без акумулятараў. Паліцыя пакуль не злавіла няздары. Засада ля кававага аўтамата напэўна дала б плён.

**СМ**

# Атака клонаў

гумарэска

Па абедзе ў аграфірме «Шал Ільліча» адбылося паўстаньне клянаваных буракоў. Яны выкапаліся зь зямлі і, незадаволеныя тэмпамі ўборкі, накінуліся на калгасьнікаў, што мірна выпівалі ля прыцэпа. Зьбітая на горкі яблык Марыля Дзюбік ратавалася ў лесе, трактарыст Заяц пасьпеў скочыць у кабіну ды, трушчачы коламі бунтаўшчыкоў, паляцеў на мэхдвор па дапамогу. Рэшта паляводчае брыгады, стаўшы сьпіна да сьпіны, зацята адбівалася сахарамі.

Захопленая клянаванымі буракамі тэрыторыя пашыралася штохвілінна. Палова вёскі ўцякла ў раён, старыя й нямоглыя сядзелі на воданапорнай вежы ў бусьлянцы ды вiламі і сякерамі адбівалі прыступы буракоў.

— Галоўнае, каб вады не абрубілі й дапамога прыйшла хаця б за дзён трыццаць. А то харч скончыцца, — казаў стары партызан дзед Юзік, размазваючы абухом неасьцярожны клубень.

Старшыня разам з участковым і пляшкаю засядалі ў сельсавеце і духам ня ведалі пра паўстаньне. Буракі засьпелі іх зьнянацку. Падпіты ўчастковы адстрэльваўся да апошняга патрона — апошні пакінуў для сябе. Старшыня, пазачыняўшы вокны й дзьверы, паліў у сэйфе паперы, каб не дасталіся ворагу. Буракі прагрызаліся пад падлогай у хату...

Калгас быў блякаваны войскамі МУС і санэпідэмстанцыяй праз некалькі гадзінаў. Галоўны доктар выказваўся за хімічную атаку, але генэрал Скарадумаў даводзіў, што буракі хіміі не баяцца. Ён настойваў на зьнішчэньні ўсяго жывога напалмам і танкамі. Каб іншая садавіна і гародніна баялася. Раптоўна буракі, якія чорнай масай раіліся вакол баявой тэхнікі, пашыхтаваліся і рушылі на склад, дзе, разьмеркаваўшыся па скрынях, зьнерухомелі.

Праз пятнаццаць хвілінаў прышкандыбаў зьбіты старшыня. Ён распавёў, што буракі ўваліліся ў хату праз комін і падлогу. Участковы апошнім патронам стрэліў у галаву, але рука здрыганулася — пацэліў у сьцягно. Самога старшыню паланілі, выкруціўшы бацьбіньнем рукі. «Давялося пагадзіцца на іх умовы, — сказаў ён, мацаючы фінгал пад вокам. — Я ўсё астатняе жыцьцё саджу ў калгасе толькі буракі ды захоўваю іх у добрым стане. Яны падвышаюць ураджайнасьць да 80 цэнтнэраў з гектара і дапамагаюць на ўборачнай — самі капаюцца і складаюцца. Галоўнае, каб калгасьнікі больш не працавалі ў полі. Ім будзе выдавацца буракоўка... Па шклянцы на чалавека... Толькі адно... Хоча галоўны бурачышча пагаварыць з прэзыдэнтам. Трэба сэлектарную нараду арганізаваць...»

* * *

Прайшло тры гады.

Чарговая сэлектарная нарада:

— Так, як справы ў Берасьцейскай вобласьці?

— Усё добра, усё расьце...

— Што добра, што расьце? Хай адкажа прадстаўнік бульбы Камянецкага раёну!

— Бульба будзе добрай, вось паглядзіце на графік...

— Параспусьціліся, панімаіш... Караладзкага жука на вас... Магілёўская гародніна, бярыце прыклад зь берасьцейцаў, вось як трэба плянаваць. А як з ідэалягічнай працай, ці адбываюцца зьлёты маладых морквак у Гарадзенскай вобласьці? Трэба, каб моладзь ведала адказнасьць моманту. Апазыцыя спрабуе пачаць ізноўку сеяць і садзіць уручную на даляры «зялёных». Учора перахопленая кантрабандная партыя экалягічнага насеньня цукровых буракоў і капусты. Трэба разабрацца і пакараць з усёй строгасьцю... Зьнятым з грады Галоўнаму Памідору Гомельскай вобласьці і Намесьніцы Галоўнай Фасоліны Менскага раёну здаць справы і прыбыць на Клецкі перапрацоўчы камбінат для падвышэньня кваліфікацыі. Канец сувязі.

Галоўны Гарбуз адключыў шматапэрацыйны апарат і адкінуўся ў фатэлі. Што-што, а сельская гаспадарка, пакуль ён пры ўладзе, не змарнее.

**Руслан Равяка**



Людка Сільнова

## У чаканьні зімы

Апусьціла галіны яліна
У жалобе па зьніклых часах.
Дні, як цьвёрдае зерне маліны,
Непрыемна захрасьлі ў зубах.

Дзе ружовая летняя слодыч?
Вальнадумства смарагдавы сьвет?..
Ссох вясёлкавых мараў букет,
І нічога ты зь ім не паробіш.

У вярбы, што расьце ля ўваходу
У дзіцячы дагледжаны парк,
Як падрэзалі косы (бароды?):
«Ўсе наперад! Ніколі назад!»

Апусьціла галіны яліна
У чаканьні сьвінцовых сьнягоў.
Водар мяса, віна, мандарынаў
Мне сагрэе замерзлую кроў!

ГІТ-ПАРАД



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### «Уліс» трымае лідэрства

**Чацьверты тур на «Тузіне гітоў»** (http://music.fromby.net) асаблівых неспадзяванак не прынёс. Лідэры тыя ж: першы «Ўліс» («Устану ранкам»), другі Памідораў («Дзень без гарэлкі»), трэці Вайцюшкевіч («Я ішоў да цябе»). Галасуюць за іх найперш фанаты канкрэтных камандаў. Таму сьвежыя музычныя прадукты ў гіт-парадзе не затрымліваюцца. Гэтым разам з барацьбы выбылі «Triquetra», «Аляксандра і Канстанцін». У барацьбу ўключаюцца «Стары Ольса» («У карчме»), «Сівер» («Гадзіньнік»), «Кулінковіч-ансамбль» («З Новым годам»). Гіт-парад можна слухаць штонядзелю ў 16.05 на радыё «Рокс».

**Сяргей Будкін**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**Беларускамоўнай газэце** тэрмінова патрабуецца дасьведчаны і энэргічны галоўны бухгальтар з вышэйшай адукацыяй і менскай прапіскай. Акрамя бухгальтарскіх справаў неабходна выконваць абавязкі офіснага мэнэджэра. Валоданьне кампутарам абавязковае. Пажаданыя веды ў галіне замежнаэканамічнай дзейнасьці. Прыстойная аплата. Т.: 8-029-672-70-60

Нагадваем нашым чытачам, што абвесткі з прапагандай палітычных, рэлігійных ды інш. ідэяў у рубрыцы «Бясплатныя прыватныя абвесткі» не публікуюцца.

### ВІТАНЬНІ

**Маладога асьпіранта** і геоляга Віталя К. з Днём народзінаў! Зычым навуковых Эвэрэстаў, заставайся сапраўдным беларусам. Родныя

**Натальля**, мая таемная незямная! З Днём народзінаў цябе, Водзіч! Правінцыйны

**Чарапашка-Водзіч**, табе, здаецца, 11 сьнежня ўжо 20! Пашлі табе Божа добрага хлопца. Надзейныя сябры

**Віншуем улюбёную** газэту з Новым годам ды Калядамі! Жыве «Наша Ніва»! Жыве Беларусь! Алена й Мікола Сенькі зь Лёндану

### МАЛЬБЭРТ

**Набуду** танна ці прыму ў падарунак б/в мальбэрт. Т.: (02161) 52-5-40 (увечары). Генадзь

### РАНІШНІКІ

**Увага!** Вывучаецца попыт на правядзеньне беларускамоўных ёлак «Навагодні акіян радасьці». Зацікаўленыя асобы, тэлефануйце: 8-029-649-08-88, 8-029-766-24-25. Групавым замоўцам — зьніжкі!!!

### КАНТАКТЫ

**Мянчук** (46/174/73), в/а, прыхільнік ЗЛЖ, пазнаёміцца з сымпатычнай, шчырай жанчынай да 36. Магчыма стварэньне сям'і. Т.: 291-99-76

**Высокі і прывабны** мянчук з дыплёмам пазнаёміцца з высакароднай, разумнай, чыстай і прыгожай дзяўчынай 23—30 гадоў для каханьня і шлюбу. Т.: 284-61-63, 8-029-639-16-81

**Хлопец**, 19 гадоў, пазнаёміцца з прывабнай дзяўчынай для сур'ёзных адносін. А/с 212, 220075, Менск

**Паэта Сяргея Законьнікава** прашу адгукнуцца дзеля дзелавога праекту. Т.: 277-58-18. Эдуард

**Алесю**, я таксама веру ў гарантыю пана Бога. Мы молімся — і будзе лепш! Алена

**Урокі геаграфіі** на цудоўнай беларускай трасянцы штодня акрамя панядзелка з 10 да 18. Музэй Караткевіча. Дзякуй спадару Кузубаву

**Аксане Новікавай!** Якая «дэмакратыя» зь дзьвюхмоўем? Максім Гарэцкі даўно ўсё сказаў пра «дзьве душы». Валянціна Мароз

**Беларускія лекары** для Вас і Вашых дзетак. http://medicus.iatp.by

**Прапаную** біядадаткі для папярэджаньня ды лекаваньня анкалягічных ды іншых захворваньняў. Толькі на аснове натуральнай сыравіны. Зьмітрусь. Т.: 8-029-766-12-79

**Купалаўскія чытаньні** штотыдзень у нядзелю а 14.00 да 16.00 каля помніка Паэту ў парку Янкі Купалы. У сьнежні — 14, 21, 28

**Запрашаем** патрыётаў-нацыяналістаў, прыхільнікаў палітычнай дзейнасьці С.Высоцкага кожны аўторак а 18.00 да помніка Янку Купалу (насупраць цырку)

**Праца** для Вас. Занятасьць поўная ці частковая. Рэальныя заробкі. Навучаньне бясплатнае. Зьмітрусь. Т.: 8-029-766-12-79

### КНІГІ

**Выданьне** «Скарб думак» бясплатна на ТБМ (Менск, Румянцава, 13). Каму ня хопіць — можна пачытаць у падшыўцы. Т.: 8-029-753-91-96. Алесь

### ЖЫТЛО

**Малады хлопец** здыме пакой на доўгі час. Парадак і своечасовую аплату гарантую. Т.: 289-12-12, аб.10177. Яраслаў

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______________________________

Імя і прозьвішча ______________________________

Адрас, тэлефон ______________________________

Вячка Станкевіч зь Нью-Ёрку падпісаў на «Нашу Ніву» пяць бібліятэк Ашмяншчыны. Вялікі яму дзякуй!

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3417. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 10.12.2003.
Замова № 6678.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а